

ДУША НА ДАЛОНІ

ЧЫРВОНКА

СПАТКАННЕ Ў ЦЕМРЫ: ШТО НЕ ЎБАЧЫШ ВАЧЫМА? 12




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

24 САКАВІКА 2022 г. ЧАЦВЕР № 57 (29679)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Галіна ЛАГУНОВА, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па эканамічнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў:**

*«Сёння надышлі няпростыя часы, якія характарызуюцца высокай ступенню нявызначанасці. Мы з'яўляемся сведкамі глабальных змен палітычнага і эканамічнага ўладкавання свету. Цяпер цяжка дакладна спрагназаваць вынік гэтых працэсаў. Але мы павінны дакладна разумець, што так, як раней, ужо не будзе. І той, хто гэта ўсведамляе і пачне аператыўна рэагаваць на тыя змены, забяспечыць базу працвітання сваёй справы ў будучыні. Цяпер не толькі час выпрабаванняў, але і час вялікіх магчымасцяў — адкрываюцца новыя рынкі. За кошт доступу да недарагіх на фоне сусветных цэн рэсурсаў, перш за ўсё энергетычных, расце канкурэнтаздольнасць нашых тавараў. Убачыць і рэалізаваць гэтыя магчымасці — шлях да поспеху і росквіту айчыннага прадпрымальніцтва».*

# ПРАЗ КНІГУ — ДА ГІСТАРЫЧНАЙ ПРАЎДЫ







Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

**Учора адкрылася XXIX Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш**

**У выставачным цэнтры «БелЭкспа» ўчора адкрылася XXIX Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш. На ёй прадстаўлены стэнды вядучых выдавецтваў Беларусі і замежных гасцей, сярод якіх Расія, Іран, Венесуэла, Куба, Пакістан ды іншыя. Сёлетні форум адметны — на гэты год прыпала шмат юбілейных для літаратуры нашай краіны дат. Пяцідзесяцігоддзе святкуе выдавецтва «Мастацкая літаратура», сто гадоў спаўняецца Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. І, канешне ж, знакавая падзея — 140-годдзе з дня нараджэння беларускіх класікаў Янкі Купалы і Якуба Коласа. На выставе-кірмашы гэтыя значныя даты абавязкова будуць адзначаны рознымі мерапрыемствамі і акцыямі.**

СТАР. 4

Свая справа

# КРЭДА — РАЗВІЦЦЁ І РУХ НАПЕРАД

## Філасофія жыцця і работы фермераў Камякоў

**Думаю, што фермерам стаць можа далёка не кожны вясковы жыхар. Нават калі браць пад увагу працавітых, дастаткова адукаваных, матываваных працаваць на зямлі. Патрэбныя таксама гаспадарская жылка, адпаведны спосаб мыслення, а яшчэ гатоўнасць да спрадвечнага сялянскага — працаваць ад цямна да цямна. Да ўсяго варта дадаць асаблівае стаўленне да зямлі. Ну гэта ўжо калі зямлі пашануе на фермера. Такога, напрыклад, як Васіль КАМЯК.**

СТАР. 13



Жыллё

# НА РЫНКУ НЕРУХОМАСЦІ — ЦІШЫНЯ

## Эксперты ўпэўнены, што бліжэй да лета адбудзецца моцнае патанненне кватэр, у сярэднім на 10—15 %

**Змяненне курса беларускага рубля і няпростая сітуацыя з выдачай крэдытаў (у тым ліку на набыццё жылля) адбілася на рынку нерухомасці, практычна ўсе ўдзельнікі якога ў стане нявызначанасці. Разам з нашымі экспертамі мы пастараемся прадбачыць, чаго чакаць у сувязі з новымі выклікамі і калі сітуацыя стане больш зразумелая.**

### Прывязка да долара тармозіць рынак

Сталічны рынак другаснага жылля пасля вядомайпературбацыі з валютай як бы заціх у чаканні карэкціроўкі цэннікаў аб'ектаў нерухомасці ў бок паніжэння. Што ні кажы, кватэры выстаўляюцца на продаж у рублях, але менавіта ў гэтых банкнотах цана нерухомасці ў нас з'яўляецца паказчыкам плаваючым. Ужо не першы дзясятак гадоў на рынку нерухомасць прывязваецца да долара, а таму прадаўцы пераліčваюць цэны па новым курсе і прапануюць пакупнікам плаціць ужо іншыя грошы. Пакупнікі ж адмаўляюцца ісці на такі крок, паколькі інфляцыі як такой у краіне не назіраецца, а ў рублёвым эквіваленце ім прапануюць купіць тавар значна даражэй. Чаму так?

СТАР. 6

КОРАТКА

• **Беларусь дазволіла да 15 красавіка бязвізавы ўезд з Украіны ўсім іншаземцам, хто ратуецца ад баявых дзеянняў.**

• БРСМ адкрывае сёння «Пункты дабра» ва ўсіх рэгіёнах Беларусі. Маладзёжная ініцыятыва «Пункты дабра» заклікана стаць своеасаблівай дабрачыннай пляцоўкай па зборы рэчаў першай неабходнасці для людзей, якія прыбываюць з Украіны на тэрыторыю нашай краіны.

• **НАН прымае заяўкі на творчы конкурс да Года гістарычнай памяці.**

ISSN 1990 — 763X


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

Падпішыся на «Звязду» – і выйграй карысны прыз!

Ідзе падпіска на II квартал 2022 года

ВЯСНА І ЛЕТА — З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ!

Наталля КАЧАНАВА:

Акцэнты

# «З ЛЮДЗЬМІ ТРЭБА ЎМЕЦЬ ПРАЦАВАЦЬ»

## Старшыня Савета Рэспублікі правяла прыём грамадзян у Светлагорску

**Шукаць дапамогі ў вырашэнні праблемных пытанняў у спікера верхняй палаты парламента вырашылі больш чым 80 заяўнікаў з розных куткоў краіны. Асобныя звароты людзей удалося вырашыць на месцы, іншыя патрабуюць больш сістэмнага высвятлення і ўзятыя Старшынёй Савета Рэспублікі на кантроль.**



Як паведамілі ў прэс-службе верхняй палаты, яшчэ да пачатку прыёму было станоўча вырашана пытанне жыхаркі Гомеля па арэндзе памяшкання ў Рэчыцы. На асабістым прыёме грамадзян да Старшыні Савета Рэспублікі звярнулася дырэктар турыстычнай фірмы. Заяўніца ўзняла пытанне, якое закранае работу ўсёй айчыннай турыстычнай індустрыі. Як звярнула ўвагу жанчына, доўгі час беларускія турагенты паспяхова працавалі з буйнымі ўкраінскімі холдынгамі праз прадстаўніцтвы ў нашай краіне. З турыстамі холдынгі напрамую ў нашай краіне не працуюць, а ўсе адносіны з людзьмі і разлікі з імі бяруць на сябе беларускія фірмы. Сёння холдынгі дзейнасць спыняюць, але перадаплату за турыстаў вяртаць не збіраюцца.

— Па нашым заканадаўстве ўся адказнасць перад турыстамі ляжыць на нас. І мы ад яе не адмаўляемся. Але на тое, каб вярнуць людзям грошы, патрэбны час. Мы падлічылі: на 17 сакавіка з-за такога рашэння толькі аднаго холдынга пацярпела 61 фірма і 549 турыстаў, шкода склала 620 тысяч беларускіх рублёў, — заяўніца дакладна вызначыла праблему, з якой сутыкнуліся турфірмы.

Яна спадзяецца, што пытанне можна вырашаць на заканадаўчым узроўні.

— Трэба аператыўна заняцца гэтым пытаннем, ініцыяваць унясенне змяненняў у заканадаўства, — падкрэсліла Наталля Качанава. — Трэба абараніць сваіх людзей і свае турфірмы.

Яшчэ адзін зварот, які ўзяла на кантроль Старшыня Савета Рэспублікі, закранае, у тым ліку, праблему замацавання спецыялістаў у раёнах.

Зварот паступіў ад сталічнага жыхара, супрацоўніка фірмы па вытворчасці медыцынскіх вырабаў. Як паведаміў заяўнік, яны з жонкай і дзіцем жывуць разам у арэнднай двухпакаёвай кватэры, якую хочуць прыватызаваць. Але па законе гэта можна зрабіць толькі ў індывідуальным парадку з дазволу Прэзідэнта.

— Цяпер мы павінны разабрацца, як можна дазволіць прыватызаваць арэнднае жыллё, каб усё было па справядлівасці, па сумленні. Магчыма, трэба ўвесці спецыяльныя ўмовы: прапрацаваць 15 гадоў на прадпрыемстве ці пражыць 10 гадоў у гэтай кватэры. Так мы будзем садзейнічаць замацаванню людзей на месцах, — перакanana Наталля Качанава.

З Магілёўскага раёна з хвалюючым пытаннем прыехала цэлая група заяўнікаў. Людзі прасілі дапамагчы разабрацца ў арганізацыі работы гаспадаркі. Па словах грамадзян, за апошнія некалькі гадоў, калі сельгаспрадпрыемствам пачала кіраваць маладая жанчына-дырэктар, у калектыве толькі канфлікты. Заяўнікі расказалі аб выпадках незаконнага звальнення работнікаў, неабгрунтаванага паніжэння ў пасадах і пазбаўлення прэмій.

— У вашу гаспадарку я абавязкова прыеду ў найбліжэйшы час, і мы на месцы разбяромся ў сітуацыі, — запэўніла Наталля Качанава.

Як зазначыла спікер верхняй палаты парламента, у практыцы яе работы са зваротамі грамадзян час ад часу ўзнікаюць пытанні, якія проста абураюць. Гэта недзе вынік і паводзін кіраўнікоў прадпрыемстваў.

— Да людзей трэба ставіцца па-добраму, з людзьмі трэба ўмець працаваць, умець размаўляць, — упэўнена Старшыня Савета Рэспублікі.

Па словах Наталлі Качанавай, у рабоце са зваротамі грамадзян вызначаюцца як пытанні, якія можна вырашыць вельмі хутка і аператыўна, так і тыя, што патрабуюць дэталёвага разгляду:

— Звароты больш сістэмнага характару, напрыклад, такія як сёння, па турыстычнай дзейнасці. Вядома, тут пытанне і заканадаўчага характару. Таму што трэба паглядзець, як сёння ўрэгулявана гэтае пытанне ў заканадаўстве і што трэба яшчэ зрабіць, каб вырашаць гэтыя пытанні і аказаць садзейнічанне тураператарам, якія працуюць у нашай краіне, і турыстычным кампаніям.

Паводле яе слоў, паступаюць і пытанні, якія можна вырашыць вельмі хутка і аператыўна.

Старшыня Савета Рэспублікі падкрэсліла, што каля 30 працэнтаў зваротаў грамадзян вырашаецца аператыўна толькі дзякуючы таму, што людзі запісваюцца на прыём.

— Прыйсці чалавеку на прыём таксама няпроста: трэба прыехаць, пахвалявацца, — зазначыла Наталля Качанава. — Таму такія пытанні, якія павінны вырашаць або мясцовыя ўлады, або кіраўнікі прадпрыемстваў, трэба вырашаць вельмі хутка і аператыўна і не выклікаць незадаволенасці людзей.

Спікер верхняй палаты падкрэсліла, што па выніках правядзення адзінага дня прыёму грамадзян у раёнах Гомельшчыны будзе прааналізавана работа са зваротамі грамадзян на ўсіх узроўнях:

— Будзем падводзіць вынікі і даваць ацэнку і дзейнасці мясцовых органаў улады, і дэпутацкага корпуса, што немалаважна. Бо сёння ёсць недапрацоўкі і дэпутатаў на месцах па вырашэнні пытанняў, якія хвалююць нашых грамадзян. Таму абавязкова дадзім ацэнку гэтай рабоце, бо ёсць закон па рабоце са зваротамі грамадзян і дакладныя даручэнні Прэзідэнта па рабоце са зваротамі грамадзян. Мы павінны гэта выконваць, гэта наш святы абавязак, — падкрэсліла Наталля Качанава.

Па словах Старшыні Савета Рэспублікі, практыка асабістых прыёмаў грамадзян у рэгіёнах вельмі добра сябе зарэкамендавала і будзе працягнута.

— Гэта важна і для нас, і для мясцовых органаў улады, дэпутацкага корпуса, таму што яны самі бачаць вузкія месцы, якія неабходна вырашыць для жыццядзейнасці жыхароў дадзенага раёна або вобласці ў цэлым, — падкрэсліла Наталля Качанава.

Як зазначыла спікер верхняй палаты, сёння можна казаць і аб тым, што тэматыка зваротаў на прыёмах апошнім часам пашыраецца: ад праблем ЖКГ да агучвання пытанняў, якія патрабуюць урэгулявання на заканадаўчым узроўні. Гэта дазваляе парламентарыям больш эфектыўна працаваць над законапраектамі.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА, фота БелТА.**

# У 22 ЧЭРВЕНЯ — НОВАЯ НАЗВА

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўчора падпісаў Указ № 117, якім карэктуецца Указ ад 26 сакавіка 1998 года № 157 «Аб дзяржаўных святах, святочных днях і памятных датах у Рэспубліцы Беларусь», паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.**

Назва памятнай даты зменена з «Дзень усенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны — 22 чэрвеня» на «Дзень усенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны і генацыду беларускага народа — 22 чэрвеня».

Указ падрыхтаваны на падставе Закона ад 5 студзеня 2022 года «Аб генацыдзе беларускага народа», у адпаведнасці з якім факты ўчынення нацысцкімі злачынцамі і іх памагатымі, нацыяналістычнымі фарміраваннямі ў гады Вялікай Айчыннай вайны і пасляваенны перыяд злачынстваў, накіраваных на планамернае фізічнае знішчэнне беларускага народа, прызнаны генацыдам беларускага народа.

На тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны фашысты стварылі больш за 260 лагераў смерці і месцаў масавага знішчэння людзей. У гэтым трагічным спісе — Трасцянец, Хатынь, Азарыцкая зона смерці, Чырвоны Бераг. Па няпоўных даных, толькі ў лагерах на тэрыторыі Беларусі загінула каля 1,5 млн чалавек. На тэрыторыі краіны знішчана больш за 9 тысяч населеных пунктаў. Усяго Беларусь страціла кожнага трэцяга свайго жыхара.

Парламенцкі дзённік

# «НАМ ПАТРЭБНА МОЦНАЯ, НЕЗАЛЕЖНАЯ ЕЎРОПА»

**Пра гэта заявіў намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Алег ГАЙДУКЕВІЧ падчас відэаканферэнцыі Парламенцкай асамблеі АБСЕ на тэму «Роля АБСЕ ва ўрэгуляванні канфлікту ва Украіне і яго наступстваў».**

«Беларусь не пакіне свае спробы наладзіць дыялог паміж Расіяй і Украінай. Мы будзем рабіць для гэтага ўсё, але не дазволім умешвацца ў нашы ўнутраныя справы», — падкрэсліў дэпутат журналістам перад выступленнем.

Мэта канферэнцыі ПА АБСЕ — абмеркаваць, што могуць зрабіць парламенты краін арганізацыі для вырашэння ўкраінскага крызісу.

«Сёння я хачу задаць еўрапейскім калегам пытанне: чаму яны замоўчваюць злачынствы ўкраінскай улады ў адносінах да ўласных грамадзян? Чаму яны маўчаць, што рускамоўных людзей (беларусаў, рускіх) пачынаюць выкідваць з працы, збіваць, пазбаўляць правоў у Еўропе? Гэта тая дэмакратыя, пра якую яны казалі? Чаму яны маўчаць аб біялабараторыях, якія знайшлі на тэрыторыі Украіны? Чаму яны маўчаць аб тым, што Беларусь просіць адкрыць гуманітарныя калідоры для таго, каб украінскія грамадзяне ішлі сюды?» — пералічыў тэмы для абмеркавання з калегамі дэпутат.

Паводле яго слоў, рашэнне адхіліць Беларусь ад кантактаў з ПАСЕ адмаўляе імкненне да дыялогу ў вырашэнні праблемы.

«Лёс Украіны вырашаецца не ў вашых кабінетах, а на тэрыторыі Беларусі ў тым ліку, а вы зачыняеце дзверы. Мы іх не зачынім, а будзем рабіць магчымае да мяжы. Бо мы яго хочам насамрэч, у адрозненне ад тых, хто пра яго толькі крычыць», — звярнуўся Алег Гайдукевіч да калег з Еўропы.

Ён таксама пракаментаваў рашэнне МЗС Беларусі аб скарачэнні ўкраінскага дыппрадстаўніцтва ў краіне. «Я вітаю рашэнне МЗС. Лічу, што гэта адэкватна, слушна. Думаю, што гэта не апошняя мера, якую мы прынялі для абароны сваіх нацыянальных інтарэсаў», — адзначыў Алег Гайдукевіч.

Як канстатаваў парламентарый, выступаючы на відэаканферэнцыі, Беларусь і яе ўлады зрабілі ўклад у спыненне вайны ва Украіне яшчэ ў 2014 годзе і далі пляцоўку для перагавораў. «Восем гадоў мы казалі, што патрэбныя перагаворы. Вы нас не слухалі, а замест гэтага ў дачыненні да Беларусі ўводзілі санкцыі, а Украіну завалілі зброяй і падтрымлівалі антырасійскія настроі. Усё, што адбылося, стала вынікам безразважнай палітыкі Захаду ва Украіне і ў цэлым у Еўропе. Што зараз робіцца для спынення гібелі ўкраінскага народа? Нічога», — выказаў сваё меркаванне дэпутат. Па яго словах, працэс узбраення Украіны, адпраўка туды наймітаў з усяго свету пагаршае крызіс у Еўропе і ўся еўрапейская бяспека знаходзіцца пад пагрозай. «Нам патрэбна моцная, незалежная Еўропа. У той дзень, калі краіны Еўрапейскага саюза стануць самастойнымі і не будуць праводзіць сваю палітыку, каб дагадзіць Вашынгтону, у Еўропе наступіць мір», — упэўнены Алег Гайдукевіч.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Узровень падтрымкі Байдэна абваліўся да 40 працэнтаў



Гэта самы нізкі паказчык рэйтынгу прэзідэнта ЗША з пачатку яго знаходжання на пасадзе, адзначаецца ў матэрыялах інфармагенцтва Reuters і сацыялагічнай службы Ipsos. Гэты паказчык апусціўся на мінулым тыдні адразу на тры працэнтныя пункты. Апытанне, праведзенае 21 і 22 сакавіка, паказала, што больш за палову — 54 працэнты — амерыканцаў не ўхваляе работу кіраўніка Белага дома на фоне высокай інфляцыі ў Злучаных Штатах і сітуацыі ва Украіне. Папулярнасць Джо Байдэна пайшла на рэзкі спад яшчэ ў сярэдзіне жніўня мінулага года, калі колькасць смерцяў ад COVID-19 у ЗША пачала расці, а амерыканскія вайскоўцы сышлі з Афганістана, удакладніла Reuters.

### У Германіі рэкордна ўзраслі цэны

Цэны вытворцаў у Германіі ў лютым узляцелі на 25,9 працэнта. Гэта наймацнейшы рост з пачатку вядзення статыстыкі ў 1949 годзе, паведаміла нямецкая газета Die Zeit. У Федэральным статыстычным упраўленні Германіі паведамілі, што не толькі энерганосьбіты, але і многія іншыя тавары каштуюць значна даражэй, чым год таму, — ад кавы да алею. Пры гэтым адзначаецца, што бягучая дынаміка цэн у сувязі з падзеямі ва Украіне яшчэ не ўключана ў статыстыку. Даследаванне праводзілася 15 лютага, да пачатку спецаперацыі. На думку экспертаў, у аснове рэзкага росту цэн ляжыць падаражанне энергарэсурсаў. У лютым значна падаражэлі прыродны газ, электрычнасць і мазут. Таксама назіраўся значны рост цэн на металы, угнаенні і драўніну. Значна падаражэлі і прадукты харчавання — на 9,2 працэнта. Асабліва рэзка выраслі цэны на нерафінаваны алей (50,1 працэнта), сметанковае масла (64,4 працэнта і каву (16,9 працэнта

Згодна з прагнозам Кільскага інстытута сусветнай эканомікі, у найбліжэйшай перспектыве нармалізацыі цэн у Германіі не прадбачыцца. «Узровень інфляцыі сёлета, які складае цяпер 5,8 працэнта, верагодна, будзе вышэйшы, чым калі-небудзь у аб'яднанай Германіі», — адзначылі аналітыкі.

### Талібы забаранілі дзяўчынкам хадзіць у школу

Міністэрства адукацыі Афганістана забараніла дзяўчынкам сярэдніх і старэйшых класаў наведваць школу. Аб гэтым паведаміў мясцовы тэлеканал Ariana News. Згодна з распараджэннем міністэрства, «сярэднія і старэйшыя школы для дзяўчынак будуць закрытыя да далейшага апавяшчэння». З пачаткам навучальнага года ў школу змогуць хадзіць толькі дзяўчынкі да шостага класа. Прычынай такога рашэння стала неадпаведнасць школьнай формы нормам мусульманскіх правілаў і звычаяў — шарыяту. У ведамстве адзначылі: калі форма для дзяўчынак з сёмага да дванаццатага класа будзе распрацавана ў адпаведнасці з шарыятам, нацыянальнымі традыцыямі і культурай, то талібы адкрыюць школы і для іх.

# ПАД ДЫПЛАМАТЫЧНЫМ ПРЫКРЫЦЦЁМ

## Ва ўкраінскім пасольстве працавалі кадравыя разведчыкі

**Нездарма ж кажуць, што шыла ў мяшку не схаваеш. КДБ ліквідаваў рэзідэнтуру Украіны, якая дзейнічала пад дыпламатычным прыкрыццём, заявіў журналістам намеснік начальніка Следчага ўпраўлення КДБ Канстанцін Бычак, паведаміла БелТА.**




«Камітэтам дзяржаўнай бяспекі на працягу апошніх гадоў фіксавалася актыўная разведвальная дзейнасць з пазіцыі Пасольства Украіны ў Рэспубліцы Беларусь, а таксама консульства гэтай дзяржавы ў горадзе Брэсце. Пры агульнай колькасці дыпламатычнай місіі Украіны крыху больш за два дзясяткі чалавек, не менш за палову з іх з'яўляліся кадравымі супрацоўнікамі Галоўнага ўпраўлення разведкі Міністэрства абароны Украіны і Службы знешняй разведкі Украіны, што з'яўляецца беспрэцэдэнтным нават для дыпмісій буйных дзяржаў і сведчыць аб выбары Украінай курса на правядзенне агрэсіўнай разведвальнай дзейнасці адносна нашай краіны насуперак нармальным дыпламатычным адносінам», — падкрэсліў Канстанцін Бычак.

### Аперацыя «Дэмакратыя ў Мінску»

Паводле інфармацыі намесніка начальніка Следчага ўпраўлення КДБ, супрацоўнікі пасольства ажыццяўлялі агентурную разведку, прадпрымаючы спробы сфарміраваць разгалінаваную сетку інфарматараў з ліку грамадзян Рэспублікі Беларусь, а таксама асабіста збіралі разведвальную інфармацыю, у тым ліку адносна беларускіх ваенных аб'ектаў.

«Прыманыя Камітэтам дзяржаўнай бяспекі меры па спыненні супрацьпраўных праяў з боку украінскіх дыпламатаў, якія павінны былі паслужыць сігналам для ўкраінскіх спецслужбаў, не спынілі варожай дзейнасці супраць нашай краіны, — адзначыў намеснік начальніка Следчага ўпраўлення КДБ. — У адпаведнасці з беларускім заканадаўствам у дзеяннях асобных украінскіх дыпламатаў ёсць прыкметы злачынства, прадугледжанага арт. 358 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь «Шпіянаж». Аднак у адпаведнасці з арт. 31 Венскай канвенцыі аб дыпламатычных адносінах названыя асобы карыстаюцца імунітэтам ад крымінальнай юрысдыкцыі дзяржавы знаходжання. У сувязі з сітуацыяй, якая склалася, Камітэтам дзяржаўнай бяспекі прыняты вычарпальныя меры па скоўванні разведдзейнасці працўніка і ліквідацыі рэзідэнтуры, якая дзейнічала пад дыпламатычным прыкрыццём».

Афіцыйны Кіеў цесна ўзаемадзейнічае са спецслужбамі Захаду, паведамілі БелТА ў Камітэце дзяржаўнай бяспекі. «Актыўна абменьваючыся інфармацыяй з суб'ектамі разведкі краін НАТА, афіцыйны Кіеў цесна ўзаемадзейнічае і са спецслужбамі Літвы. З 2016 года пашыраецца украінска-літоўскае супрацоўніцтва ў сектары бяспекі і абароны, паміж разведвальнымі і контрразведвальнымі ведамствамі заключаны дадатковыя пагадненні аб супрацоўніцтве, — паведамілі ў КДБ. — У інтарэсах Галоўнага ўпраўлення разведкі Міністэрства абароны Украіны актыўную работу на беларускім напрамку праводзяць цэнтры інфармацыйна-псіхалагічных аперацый сіл спецыяльных аперацый Міністэрства абароны Украіны (ЦІПСА), якія рэалізоўваюць накіраваную інфармацыйную палітыку Кіева, дыскрэдытуюць падзеі і з'явы на шкоду нацыянальным інтарэсам Беларусі, ажыццяўляюць інфармацыйную агрэсію. Устаноўлена, што магчымасці ЦІПСА выкарыстоўваюцца, а ў некаторых выпадках замыкаюцца на Службу бяспекі Украіны па лініі абароны дзяржаўнага суверэнітэту».

Сілы і сродкі ЦІПСА задзейнічаюцца ў сацыяльных сетках, пабліках, грамадскіх электронных пляцоўках, інфармацыйных сайтах, праз падстаўных асоб курыруюць работу СМІ. У КДБ адзначылі задзейнічанне рэсурсаў адпаведных цэнтраў у інтарэсах Літвы і Польшчы на шкоду нацыянальнай бяспецы Беларусі ў поствыбарчы перыяд. «Вядома, што 17 жніўня 2020 года ў Кіеве адбылася нарада кіраўнікоў ваенных разведак Украіны, Польшчы і Літвы, у ходзе якой дасягнута дамоўленасць аб арганізацыі ўзаемадзеяння паміж падраздзяленнямі інфармацыйна-псіхалагічных аперацый на беларускім напрамку ў рамках правядзення ўкраінскімі спецслужбамі аперацыі «Дэмакратыя ў Мінску», накіраванай на дэстабілізацыю палітычнай сітуацыі ў Беларусі», — паведамілі ў КДБ.

### Прапанавалі пакінуць краіну

Беларусь прапанавала частцы ўкраінскіх дыпламатаў пакінуць краіну. Аб гэтым паведаміў прэс-сакратар Міністэрства замежных спраў Анатоль Глаз.

Ён адзначыў, што з 2020 года беларускім бокам фіксаваліся шматлікія недружалюбныя дзеянні Украіны, накіраваныя на бездакзанае разбурэнне міждзяржаўных адносін з Беларуссю, дзелавых кантактаў і сувязяў паміж людзьмі, якія даўно ўстаяліся. «Дайшло да таго, што ўкраінскія ўлады пачалі непасрэдна або ўскосна ўмешвацца ў нашы ўнутраныя справы, паставілі на нейкую паўзу кантакты паміж дзяржавамі. Яшчэ ў 2021 годзе на высокім афіцыйным узроўні назвалі Беларусь варожай краінай», — згадаў прэс-сакратар.

Паводле яго слоў, за гэтымі заявамі, на жаль, было здзейснена шэраг практычных дэструктыўных дзеянняў: «Дастаткова згадаць, што ў рамках незаконнай авіяблакады кіраўніцтва Украіны адзінае з усіх краін, якія далучыліся, не дазволіла пралёт праз сваю тэрыторыю нават гуманітарнага рэйса з беларускімі грамадзянамі. Падкрэслю, усё гэта ініцыятыўна і гучна ажыццяўлялася ў адносінах да Беларусі, якая нават у самыя складаныя часы не зрабіла ніводнага антыўкраінскага кроку».

На гэтым фоне беларускаму боку было таксама вядома аб дзейнасці шэрагу супрацоўнікаў пасольства і генеральнага консульства Украіны ў Беларусі, несумяшчальнай з дыпламатычным статусам. Актыўнасць гэтай дзейнасці нарастала. «Украінскі народ пры любых абставінах быў і застаецца для нас брацкім, а Украіна — суседкай. Менавіта гэты пастулат і разлік на разважлівасць ляжаў у аснове заўсёды стрыманай рэакцыі беларускага боку, — падкрэсліў Анатоль Глаз. — Але за граню нашага разумення знаходзяцца нядаўнія дзеянні ўкраінскіх уладаў у адносінах да ні ў чым не вінаватых беларускіх грамадзян, якія не па сваёй волі апынуліся ў зоне канфлікту. Канфіскацыя маёмасці, хамскае абыходжанне з беларускімі дыпламатамі і членамі іх сем'яў на кантрольна-пропускным пункце «Магілёў-Падольскі» — усё гэта цынічныя спробы распаліць нянавісць паміж народамі, перанесці палітычныя звады на простых людзей. Мы такога ніколі не дапусцім».

«У поўнай адпаведнасці з арт.11 Венскай канвенцыі аб дыпламатычных адносінах Рэспублікай Беларусь прынята рашэнне аб скарачэнні колькасці ўкраінскіх дыпламатаў на сваёй тэрыторыі», — сказаў Анатоль Глаз. Гэты крок, паводле яго слоў, накіраваны на спыненне недыпламатычнай дзейнасці шэрагу супрацоўнікаў украінскіх замежустаноў. «Ім прапанавана пакінуць нашу краіну на працягу 72 гадзін», — заявіў прэс-сакратар МЗС. Украінскае пасольства працягне работу ў Беларусі ў фармаце 1+4, гэта значыць, пасол і чатыры супрацоўнікі.

«У сувязі з фактычнай адсутнасцю персаналу беларускім бокам таксама прынята рашэнне аб закрыцці консульства Украіны ў горадзе Брэсце. Яшчэ раз падкрэслю, што ўкраінцы былі і будуць заставацца для нас блізкім народам», — заўважыў Анатоль Глаз. Ён таксама ўдакладніў, што беларускі бок не прымаў рашэнне аб закрыцці свайго пасольства ва Украіне.

### Шпіёнскае кубло

Мы маем справу са стварэннем шпіёнскага кубла ў цэнтры Мінска, якое займалася падрывам беларускай дзяржаўнасці. Аб гэтым заявіў старшыня праўлення Беларускага таварыства «Веды» Вадзім Гігін у эфіры «Салаўёў Live».

«У дачыненні да ўкраінскага пасольства ў нас ніколі асаблівых ілюзій не было. Украінская дыпламатыя — гэта нешта асаблівае. Дапусцім, пасол Украіны ў Беларусі Ігар Кізім заўсёды адрозніваўся, мякка кажучы, зусім недыпламатычнымі звычкамі. Мы неаднаразова рабілі заўвагу на гэты конт. Тое, што выявілася цяпер, — вынік доўгачасовага назірання за дзейнасцю гэтых нібыта дыпламатаў, — сказаў Вадзім Гігін. — Дарэчы, украінскае пасольства выступала ў якасці аднаго з такіх каардынацыйных цэнтраў у 2020 годзе. Яны наўпрост спансіравалі, падтрымлівалі, кіравалі дзейнасцю штатных прапагандыстаў, так званых апазіцыйных. Такіх як Івашын і гэтак далей. Прычым яны закраналі пытанні, якія някага дачынення да беларуска-ўкраінскіх сувязяў не мелі, праекты нашага супрацоўніцтва з журналістамі. Сам пасол Кізім даваў на гэты конт прамыя ўказанні — збіраць любую магчымую інфармацыю».

**Пётр ДУНЬКО.**

---

Па сутнасці

# НА САВЁЙ ЗЯМЛІ



**Каб зразумець горад, трэба ведаць яго помнікі. Нашы ўражваюць. А некаторыя прымушаюць спыніцца. Падумаць аб часе і прасторы. Спыніцца нават у самых вірлівых кутках беларускай сталіцы.**

Паміж бойкай Камароўкай і паважным, як і належыць, сталічным гандлёвым цэнтрам, дый яшчэ са старой добрай назвай — ЦУМ, — зручна ўладкаваўся дзядзька Якуб. Сядзіць у задуменні. Погляд строгі, экзаменацыйны. А часам здаецца, свідруе позіркам нас — нашчадкаў.

Маўляў, ну што, браткі-беларусы, мары класікаў аб нацыянальнай ідэі спраўдзіліся. Замест спрадвечнага пытання — «А хто там ідзе?» зычна гучыць: «Мы — беларусы», а далей вы і самі ведаеце.

І мара літаратурнага Міхала спраўдзілася. Ёсць «свая зямля, свой родны кут». На жаль, у зямлі не заўжды ёсць гаспадар. І ў маштабах бацькоўскага надзелу, і ў некаторых вялізных аграхолдынгах. Ёсць тэхналогіі, тэхніка, сучасныя жывёлагадоўчыя комплексы, асфальт у сельскай мясцовасці, прасторныя дамы, палацы мастацтва... Усё гэта ёсць. Не хапае працавітых вяскоўцаў. Хоць дэфіцыт кадраў цяпер вырашаецца. У пошуках лепшага жыцця і будучыні ў Беларусь мігрыруюць паўднёвыя суседзі.

За савецкім часам украінцаў называлі нацыяй яфрэйтараў. Чаму? Спытайцеся ў тых, хто на зубок ведае прысягу Савецкага Саюза. І вось заўжды больш спрытныя, а за гады «самасційнасці» і яшчэ выхаваны абыякавасцю ўладаў украінцы самі гатовыя ўладкоўваць сваё жыццё ў Беларусі. А ім тут яшчэ як у гатэлях, розныя кампліменты ад уладаў. Работу ці не губернатары шукаюць.

А ў гэты час некаторыя беларусы працягваюць жыць у «Тэлеграме» і абмяркоўваць, як паступова вымірае глыбінка і пусцее сталіца (маўляў, хаваюцца мінчукі). І ва ўсім гэтым абвінавачваюць улады. Прывыклі мы да дзіцячага светапогляду. Бацька павінен дапамагчы, вырашыць, а калі што не так, то адказазь за ўсё. Атрымліваецца такая вось «дыктатура».

У нацыянальнай літаратуры ёсць такі вобраз — Зносак. Ён заўжды хаваецца — за шырму або спадніцу. Ён з тутэйшых. А ў сучаснай нацыянальнай рэчаіснасці гэты вобраз трансфармаваўся ў небараку. Яму ўсе павінны. Знасілаў—Знасілоўскі нашага часу абвінавацiць ва ўсім Бацьку. Але не ў тым бяда. Такія людзі будуць заўжды. Бяда ў тым, што ўсякія Знасілоўскія ўяўляюць сябе Здольнікамі. З невераготных яны, са змагароў!

Пра глыбінку спрачацца не буду. Забыліся мы на бацькоўскую хату. Дзякуй Богу, не ўсе. Не ўсе з галавой ды сэрцам кінуліся ў фрыланс ды ІТ. І, дарэчы, напіўшыся іншаземных газіровак, назапасіўшы тлушчу ад заморскай «хіміі» і вопыту ад жыцця, моладзь вяртаецца на бацькоўскія сцежкі. Гэта сёння кажуць: касмапаліт, грамадзянін свету. Раней было больш зразумела — жабрак. Ні хаты, ні рыдлёўкі. Ні жонкі, ні дзяцей. Гэта цяпер дыпламатычна кажуць «фэйк» — раней было больш зразумела: мана, хлусня.

За пустыя вясковыя сядзібы я не хвалююся. Украінскія мігранты там яшчэ буракі пасадзяць. І за сталіцу, якая быццам бы пусцее, я таксама не хвалююся. Ні за гандлёвы цэнтр, ні за Мінск увогуле. Дастаткова зайсці ў любую шматпавярховую краму ў выхадныя дні. Па-першае, гэтых гандлёвых цэнтраў больш, чым з'ездаў КПСС у свой час. І ў кожным, маю на ўвазе, цэнтры, чарга — нібы ў галоўны савецкі некропаль у гады развітога сацыялізму. Але колькі б ні было тых гандлёвых цэнтраў, галоўнае ж, як трапна заўважыў модны спявак Віталь Карпанаў: «Не прадаецца хата бацькоў».

Мо так санкцыі на суайчыннікаў падзейнічалі. Але па праўдзе кажучы, чэргі ў крамах пастаянна. Бо мы сапраўдная нацыя «небарак». Буднямі ўвечары машыну не ўладкаваць, у выхадныя ў кавярнях месца не знайсці. А так насамрэч — Мінск увесь збег.

Мне так падаецца, сталіца планава збягае кожную пятніцу а пятай гадзіне вечара, называецца тое «эвакуцыя» на лецішча, а вяртаецца — кожную нядзелю. Такі вось сыход атрымліваецца. Але ж шукаць нам, беларусам, «запаветную зямлю» наўрад ці трэба. Наша надзейная спадчына —- тая самая зямля пад нагамі. Пра якую дзядзька Якуб некалі напісаў: «Мой родны кут, як ты мне мілы...»

Вось, напрыклад, у народным бытавым календары і свята 22 сакавіка ёсць — Сорак саракоў. На Палессі дасюль рэальна вясну гукаюць. Птушкі вяртаюцца з заморскіх берагоў. Гэта нагадвае і нас саміх. Якія б гатэлі найвышэйшага ўзроўню з функцыямі «ол інклюзіў» ні вабілі, мы вяртаемся ў родныя гнёзды —- дадому.

«Мой родны кут, як ты мне мілы...» За намі назіраюць. Не толькі помнікі. Назіраюць з нябёсаў, з выраю. Соромна будзе, калі страцім сябе і здабытую Спадчыну. А пакуль у цэнтры і каля купала «Сталіцы» пад распасцёртымі крыламі архітэктурных буслоў чуваць шматгалосы гоман дзятвы — будучага краіны. І гэта толькі-толькі ад зімняга сну абуджаецца вясна. Сапраўднае цяпло яшчэ наперадзе.

**Яўген ПУСТАВОЙ.**

# ПРАЗ КНІГУ — ДА ГІСТАРЫЧНАЙ ПРАЎДЫ

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)*

На ўрачыстым адкрыцці першы **намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім РЫЖАНКОЎ** зачытаў прывітанне кіраўніка дзяржавы ўдзельнікам і гасцям выстаўкі. У ім Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што форум праходзіць у Год гістарычнай памяці пад агульным слоганам «Рака часу Бацькаўшчыны». Менавіта таму, распавядаючы аб падзеях мінулага, перадаючы веды аб спрадвечных нацыянальных традыцыях, кніга вучыць любіць родную зямлю і шанаваць памяць продкаў. Прэзідэнт адзначыў, што ён перакананы ў тым, што, аб'ядноўваючы чытачоў, пісьменнікаў і выдаўцоў розных пакаленняў праз любоў да кнігі, мы здольныя не толькі звязаць мінулае і сучаснасць, але і вызначыць будучыню.

Ад сябе Максім Рыжанкоў дадаў, што сёлетні мінскі кніжны форум мае шмат вартасцяў:

— XXIX Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш насычана шматлікімі інтэрактыўнымі акцыямі, павільёны багатыя на цікавыя кніжныя навінкі. Сёння нас усіх аб'ядноўвае любоў да кнігі — мы прыйшлі сюды па чарговага сябра. Упэўнены, што кожны з нас знойдзе добрае выданне.

**Міністр адукацыі Андрэй ІВАНЕЦ** адзначыў:

— Кніга заўсёды была, ёсць і будзе крыніцай ведаў, культуры, адукацыі і выхавання. У век лічбавых тэхналогій так званыя аўтары, якія карыстаюцца электроннымі сродкамі інфармацыі, не заўсёды разумеюць тую адказнасць, якую нясуць перад аўдыторыяй. Паважаныя пісьменнікі, жадаю вам, каб вы былі сярод тых, хто разумее, якой сілай валодае слова.




Пісьменніца Кацярына ХАДАСЕВІЧ-ЛІСАВАЯ прэзентацыі сваіх дзіцячых кніг ператварае ў міні-спектакль.

— XXIX Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш засведчыла, што Беларусь, і ў прыватнасці горад Мінск, дзе праходзіць сённяшняе мерапрыемства, — гэта пляцоўка мірнага добрасуседства.

У выставачным цэнтры «БелЭкспа» на працягу пяці дзён можна будзе пазнаёміцца з амаль усімі выдавецтвамі нашай краіны. Сярод іх прадстаўлены «Мастацкая літаратура», «Беларусь», Выдавецкі дом «Звязда», «Аверсэв», «Адукацыя і выхаванне», «Вышэйшая школа», «Народная асвета». Спіс, вядома, далёка не поўны.

Вядучы спецыяліст Выдавецкага дома «Звязда» Людміла Драздова адзначыла шырока прадстаўлены на нашым стэндзе асартымент дзіцячай літаратуры. Маленькіх наведвальнікаў чакае інтэрактыўная прэзентацыя ад пісьменніцы Кацярыны Хадасевіч-Лісавой — аўтарка пазнаёміць чытачоў са сваёй новай кнігай «Сакрэты аднаго каралеўства». Можна будзе набыць і новую кнігу казак і апавяданняў Алеся Карлюкевіча «Пясочнае мора». Таксама ў дзень адкрыцця форуму прайшла прэзентацыя кнігі Міхася Пазнякова «Канцэрт» (вершы праілюстраваны цудоўнымі малюнкамі Дар'і Чарняўскай).

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» святкуе 50-годдзе. Менавіта таму на сёлетнім форуме будзе прадстаўлена найбольш поўна і яскрава:

— На нашым стэндзе пройдуць самыя значныя мерапрыемствы, звязаныя з юбілеем нашага выдавецтва, а таксама з 140-годдзем з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа, — адзначыў **дырэктар «Мастацкай літаратуры» Алесь БАДАК.** — Сярод нашых запрошаных гасцей, якія будуць штодня прымаць удзел у мерапрыемствах, — музей Янкі Купалы і музей Якуба Коласа.

Алесь Бадак дадаў, што яму складана вызначыць найбольш яскравыя навінкі сярод выданняў «Мастацкай літаратуры» — выдавецтва імкнецца задаволіць густы ўсіх чытачоў, таму і атрымліваецца, што кнігі выходзяць разнапланавыя. Дырэктар адзначыў «Народную серыю», якая фарміравалася з улікам пераваг аўдыторыі: гэта выбраныя творы класікаў беларускай літаратуры Васіля Быкава, Максіма Багдановіча, Янкі Купалы.

Павільён выдавецтва «Беларусь» таксама карыстаецца папулярнасцю сярод наведвальнікаў выстаўкі-кірмашу.

— У нас традыцыйна багаты і цікавы павільён, — распавёў **дырэктар выдавецтва «Беларусь» Сяргей ПЕШЫН.** — Наш асартымент пашырыўся ў тым ліку і энцыклапедычнымі кнігамі. Вялікую ўвагу надаём і дзіцячай літаратуры, таксама не пакідаем і нашу традыцыйную тэматыку мастацтва — плануем стварыць каля 15—18 тамоў у супрацоўніцтве з Нацыянальным мастацкім музеем.

На XXIX міжнароднай кніжнай выстаўцы-кірмашы шырока прадстаўлены і плён Саюза пісьменнікаў Беларусі. Як адзначыла **першы намеснік старшыні саюза Алена СТЭЛЬМАХ,** на іх пляцоўцы плануюцца выступленні літаратараў з розных куткоў Беларусі:

— Наша мэта — усебакова і яскрава распавесці аб культурніцкай спадчыне розных гарадоў і вёсак краіны.



**Міністр інфармацыі Уладзімір ПЯРЦОЎ** паведаміў, што ў выстаўцы прымаюць удзел прадстаўнікі 12 краін. Ён пажадаў пісьменнікам і выдаўцам плённай, натхнёнай працы над новымі выданнямі.

— Кніжныя выставы-кірмашы — гэта магчымасць пазнаёміцца з тым, што трэба чытаць. Таму што сюды прывозяцца найлепшыя выданні. Такія мерапрыемствы, пэўна, як і бібліятэкі, даюць нашым кнігам біяграфіі. Таму мы, пісьменнікі, вельмі ганарымся, што прымаем у гэтым удзел, — адзначыў **кіраўнік Саюза пісьменнікаў Расіі Мікалай ІВАНОЎ.**

А яго беларускі калега **Алесь КАРЛЮКЕВІЧ** падкрэсліў:

Кніжная выстаўка-кірмаш скончыцца 27 сакавіка. На ўсе дні запланавана шмат мерапрыемстваў: пачынаючы з прэзентацый кніг і заканчваючы падвядзеннем вынікаў літаратурнага стартапу «LitUp». «Звязда» будзе сачыць за ўсімі падзеямі форуму — найбольш цікавыя і запамінальныя моманты з'явяцца на старонках газеты.

**Арына КАРПОВІЧ.**
***Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА, Лізаветы ГОЛАД.***

# З АДКАЗНАСЦЮ ЗА ЧАС

**Сёлета шмат хто з замежных удзельнікаў Міжнароднага сімпозіума «Пісьменнік і час» не здолеў трапіць у Беларусь. Пандэмія, а яшчэ імкненне асобных палітыкаў разбурыць мірнае суіснаванне народаў і дзяржаў, накладваюць свой адбітак на рэчаіснасць. Хтосьці з літаратараў выказаўся ў фармаце анлайн, хтосьці перадаў свае думкі папярэдне. А мы звярнуліся да пісьменнікаў замежжа з адным пытаннем — пра тое, як захаваць мір.**



**Святлана Ананьева, кандыдат філалагічных навук, загадчык аддзела міжнародных сувязяў Інстытута літаратуры і мастацтва імя М. А. Аўэзава Камітэта навукі Міністэрства навукі і адукацыі Рэспублікі Казахстан:**

— На многія развагі настроіла ўжо сама назва міжнароднай сустрэчы анлайн і афлайн — «Грамадзянская і мастацкая адказнасць пісьменніка перад чытачом». Я не першы раз сустракаюся з беларускімі калегамі. Бачу і разумею, якія выключныя намаганні прыкладае кіраўніцтва краіны, Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка для захавання міру. Колькі розных міралюбівых ініцыятыў вылучалі беларусы! І шкада, што не ўвесь свет чуе ваш голас, голас розуму і стабільнасці. Мы ўважліва сочым за падзеямі ў Беларусі. І верым у тое, што ваша грамадзянская актыўнасць — аснова добрасуседства.



**Мікалай Чаркашын, празаік, публіцыст (Расійская Федэрацыя):**

— Апошнія гады я працаваў над гістарычнымі раманамі, прысвечанымі драматычным падзеям 1941 года, падзеям першых дзён Вялікай Айчыннай вайны. Адкрыў шмат цікавых фактаў. Збіраючы іх, удзельнічаў у палявой рабоце беларускіх і расійскіх пошукавікаў. І, вядома ж, адна з тэм міжнароднага сімпозіума — «Гістарычная памяць — аснова выхавання грамадства» — мне надзвычай блізкая. Лічу, што нам, як ніколі, сёння варта зазірнуць у памяць Вялікай Айчыннай вайны, разгледзець той боль, асэнсаваць тыя выпрабаванні, якімі прайшоў праз гады ліхалецця савецкі народ, прайшлі плячо ў плячо рускія і беларусы, узбекі і ўкраінцы, прадстаўнікі дзясяткаў нацыянальнасцяў, людзі-інтэрнацыяналісты. І тут варта заўважыць, што пісьменнікам даволі часта бракуе публіцыстычнай ініцыятывы. Трэба прыйсці да тэлебачанне, радыё, сёння пісьменніцкае слова праўды пра Вялікую Айчынную вайну патрэбнае і ў новых сацыяльных сетках...



**Салім Хатлані, празаік, перакладчык (Таджыкістан):**

— Я працаваў у Рэспубліцы Беларусь як дыпламат. І заўсёды стараўся ўдзельнічаць у кніжных, літаратурных імпрэзах, мерапрыемствах самага рознага характару, якія ладзяць Міністэрства інфармацыі, Саюз пісьменнікаў Беларусі. Дзякуй і цяпер за запрашэнне паўдзельнічаць у абмеркаванні актуальных мастацкіх, літаратурных, грамадска-палітычных пытанняў. Адно з пытанняў, якое прапанавалі да разгляду арганізатары сімпозіума, — «Выбар творчых рашэнняў у пошуках мастацкай і жыццёвай праўды». Мяркую, што нам, маючы за плячыма прафесійны пісьменніцкі вопыт, патрэбна як мага больш цесна працаваць з творчай моладдзю, з маладымі людзьмі ўвогуле. Пошук духоўных, маральных арыенціраў часам аказваецца марным. Для асэнсавання, якую ролю адыгрывае слова ў сцвярджэнні гуманістычных ідэалаў, патрэбна часцей наладжваць розныя пляцоўкі для абмеркавання, ствараць прасторы прыхільнікаў сусветнага добрасуседства. І ў Мінску, Беларусі гэта разумеюць. Мы, са свайго боку, у Таджыкістане, вельмі высока ацэньваем гэтае разуменне. І заўважу яшчэ як перакладчык: нягледзячы ні на якія складанасці, давайце часцей выдаваць анталогіі, калектыўныя зборнікі, якія прадстаўляюць у нашых краінах літаратуры іншых народаў. Такія перакладчыцкія праекты дазволяць шырэй расказваць нашым чытачам у нацыянальных кватэрах адзін пра аднаго.



**Даяна Лазарэвіч, перакладчыца (Сербія):**

— У апошні час я пераклала на сербскую мову творы Янкі Купалы, Віктара Кажуры, Валерыя Казакова, Святланы Быкавай і іншых беларускіх пісьменнікаў — як класікаў, так і сучаснікаў. У Сербіі праз гэтыя кнігі адкрываецца свет беларусаў і Беларусі. Мастацкая літаратура, мастацкае слова — трывалы мост паміж народамі. Зазіраючы ў змест твораў беларускіх пісьменнікаў, мы шукаем тыя трывалыя асновы духоўнасці, патрыятызму, якія дапамагаюць беларусам выжыць, прайсці праз самыя жорсткія выпрабаванні. Разам пісьменнікі, якія думаюць пра лёсавызначальнасць духоўнасці, патрыятызму, — вялікая магутная сіла!..

**Запісаў Сяргей ШЫЧКО.**

# ПАРАД ВЫРАДКАЎ

## Чаму Латвія ператварылася ў глабальнае логава нацыстаў



**Мэр Рыгі Марціньш Стакіс заклікаў забараніць у горадзе маштабныя ўрачыстасці 9 мая каля помніка Перамогі, паведаміла Delfi. «Маё асабістае меркаванне, што такое мерапрыемства не павінна адбывацца», — сказаў Стакіс у інтэрв'ю латвійскаму тэлебачанню. Ён таксама заклікаў арганізатараў урачыстасці не прыходзіць у мэрыю з просьбай правесці мерапрыемства. Па словах мэра, калі жыхары Рыгі паспрабуюць аспрэчыць такое рашэнне ў судзе, то гарадскія ўлады ў любым выпадку могуць забараніць святочны гандаль і салют каля помніка Перамогі. Раней міністр юстыцыі Латвіі Яніс Борданс заклікаў усе латвійскія самакіраванні, у тым ліку Рыжскае, не выдаваць 9 мая дазволы на правядзенне публічных мерапрыемстваў, звязаных з Днём Перамогі. Тым часам у Латвіі няма ніякіх перашкод для правядзення шэсцяў легіянераў СС. Адно з такіх мерапрыемстваў адбылося ў Рызе 16 сакавіка. У ім узялі ўдзел і латвійскія дэпутаты. Чаму Латвія ператварылася ў сусветнае логава нацыстаў?**

### Імя ім — легіён

Латышскі легіён СС быў створаны камандаваннем нацысцкай Германіі ў гады Другой сусветнай вайны з дзвюх грэнадзёрскіх дывізій, якія знаходзіліся пад асабістым камандаваннем рэйхсфюрэра СС Генрыха Гімлера. Паводле даных РІА «Навіны», упраўленне ФСБ па Омскай вобласці рассакрэціла дакументы ваеннай контрразведкі «Смерш», у тым ліку пратаколы допытаў, на якіх латышскія карнікі СС, што ўдзельнічалі ў расстрэле мірных жыхароў, у тым ліку яўрэяў, у страшных дэталях расказалі, як знішчалі людзей, у тым ліку жанчын і немаўлят. Па словах аднаго з латышоў, які пайшоў на добраахвотнае супрацоўніцтва з нацыстамі, толькі ў Мінску СС расстралялі больш за 10 тысяч мірных жыхароў. Як сцвярджае доктар гістарычных навук, вядучы навуковы супрацоўнік Санкт-Пецярбургскага інстытута гісторыі РАН Барыс Кавалёў, гэтыя паліцэйскія злучэнні, насуперак пазіцыі сучаснай Рыгі, фарміраваліся выключна на добраахвотнай аснове.

Пасля заканчэння вайны значная частка латышскіх салдат і афіцэраў СС не без дапамогі нацысцкага кіраўніцтва эмігравала за мяжу. Паводле даных расійскага фонду «Гістарычная памяць», па стане на 2020 год былі ўстаноўлены асобы 96 легіянераў, якія працягвалі жыць на тэрыторыі ЗША, Аўстраліі, Бразіліі і іншых краін. У самой Прыбалтыцы іх колькасць на той час даходзіла да чатырох сотняў.

Першыя спробы рэабілітаваць калабарацыянізм у Латвіі пачаліся неўзабаве пасля распаду СССР. Ужо ў сярэдзіне 1990-х легіянеры і латышскія нацыяналісты, якія выжылі, пачалі штогод выходзіць на гарадскія вуліцы з нацыянальнымі сцягамі ў руках. Галоўным арганізатарам і ідэолагам выступіла арганізацыя «Ястрабы Даўгавы», якую ў 1945-м арганізавалі латышскія ветэраны СС, якія здолелі пазбегнуць правасуддзя.

Першапачаткова арганізацыя з'явілася ў адным з саюзніцкіх лагераў для ваеннапалонных у Бельгіі. Пасля заканчэння вайны большасць яе членаў перабралася ў Мюнстэр, дзе стварылі штаб, а пазней адкрылі філіялы ў 12 краінах. Да сярэдзіны XX стагоддзя да «ястрабаў» сябе прылічвала каля дзевяці тысяч чалавек. Многія з іх здолелі пазбегнуць пакарання, супрацоўнічаючы з разведкамі заходніх дзяржаў.

### Мары пра «рэканкісту»

Латвія, нягледзячы на пратэсты многіх краін і міжнародныя рэзалюцыі, не лічыць памагатых нацыстаў і ўдзельнікаў карных аперацый па знішчэнні мірнага насельніцтва, катаў, якія паўсталі на судзе ў Нюрнбергу, людзьмі, што заслугоўваюць пакарання. Маршы былых легіянераў «Вафен-СС» тут ладзяцца на працягу амаль 30 гадоў. Апошнім часам з натуральных прычын карнікаў у санкцыянаваных уладамі шэсцях становіцца ўсё менш, сярод удзельнікаў пераважае моладзь, якую актыўна ўцягваюць у працэс. Пры гэтым на мерапрыемствах у Рызе ўсё часцей можна сустрэць нацыстаў з суседніх прыбалтыйскіх краін — Літвы і Эстоніі.

Сёлета акцыя была праігнаравана прадстаўнікамі вышэйшага кіраўніцтва краіны. Але з'явілася некалькі дэпутатаў Сейма ад нацыянальнага аб'яднання. «У Латвіі ёсць кіруючая кааліцыя, туды ўваходзяць дзве неанацысцкія партыі, нацыянальныя аб'яднанні і новая кансерватыўная партыя. Калі дзве партыі — неанацысты, адзін дэпутат паехаў ваяваць ва Украіну супраць рускіх, іншыя апасаюцца або ляну юцца, што здзіўляюцца, калі антыфашыстам не дазваляюць нейкія дзеянні ў гэты дзень. Іх узбудзіла словазлучэнне «інтэрнацыянальны легіён», якое прыдумаў Зяленскі ці яго саветнікі. Ужо прагучалі прамовы аб тым, што там могуць сябе праявіць людзі, якія раскажуць пра латышскі легіён СС», — растлумачыў tvzvezda.ru кіраўнік даследчых праграм фонду «Гістарычная памяць» Уладзімір Сіміндзей.

Дарэчы, пра цесныя сувязі і супрацоўніцтва латвійскіх і ўкраінскіх неанацыстаў на чале з дарадцамі і ваеннымі інструктарамі з ЗША вядома даўно. Яшчэ ў 2020-м у інфармацыйнай прасторы Латвіі разарвалася медыябомба — мясцовы сайт, які раней спецыялізаваўся на цкаванні рускай суполкі ў краіне, нечакана апублікаваў вялікі матэрыял, прысвечаны наймацнейшым сувязям латышскіх і ўкраінскіх праварадыкалаў. Аказалася, у іх ёсць шмат агульнага — і тыя, і другія бачаць сябе ўдзельнікамі «рэканкісты», заклікаючы вызваліць Еўропу з-пад улады «дэкадансу», які ахапіў Стары Свет.

### Паралельная рэальнасць

Сёлета марш у Рызе назвалі «цырымоніяй ускладання кветак». Гэта было зроблена для Міністэрства ўнутраных спраў, якое не рэкамендавала ладзіць марш, каб пазбегнуць правакацый. Бо настрой у грамадстве і так нестабільны. Але фашыстаў не спыніць. Таму «парад вырадкаў» у Рызе ўсё ж прайшоў. «Легіянеры не становяцца маладзейшымі. Многія ўжо не разумеюць, куды іх вязуць у інвалідных калясках і што гэта за марш, якія песні граюць. Унукі ўздымаюць ім рукі ў нацысцкіх прывітаннях, а пасля кладуць гэтыя рукі, паралізаваныя, назад. Гэтыя дзядулі і бабулі знаходзяцца ўжо ў паралельнай рэальнасці, а многія ўнукі з'ехалі на заробкі і працягваюць пакідаць Латвію. Прэм'ер-міністр Карыньш мог бы выклікаць кіраўніка нацыянальнага аб'яднання, перагледзець кааліцыйнае пагадненне, сказаць, што так рабіць нельга. Але гэта не будзе зроблена, і такія маршы будуць адбывацца ў далейшым», — пракаментаваў сітуацыю vesti.ru шэф-рэдактар Sputnik Літва Марат Касем.



Нацысцкі дух легіянераў СС у Латвіі падаграецца на ўрадавым узроўні, але відавочна аслабеў сярод тых, хто штогод маршыруе у сакавіку. Сёлета ўдзельнікі шэсця запатрабавалі ахову. У выніку людзей, якія спявалі гімн Трэцяга рэйха, суправаджалі моцныя дзецюкі. Як высветлілася, гэта былі супрацоўнікі спецслужбаў у цывільным, заўважыла vesti.ru. Але іх умяшанне не спатрэбілася. Арганізатары (у іх ліку — дэпутаты ад нацыянальнага аб'яднання сейма) планавалі надаць шэсцю антырасійскі тон і падтрымаць Украіну, але садзейнічання ў большасці ўдзельнікаў не знайшлі.

«Ёсць свядчанні антырасійскай ідэалогіі, якія ляжаць у аснове Латвійскай постсавецкай дзяржавы. Але тое, што адбываецца на Украіне, тая рыторыка, якая гучыць ва ўкраінскіх СМІ і ў вуснах украінскіх палітыкаў, стала залішне радыкальнай і маргінальнай для іх латвійскіх супольнасцяў — латвійскіх нацыкаў, так што тут было жаданне размежавацца», — адзначыў vesti.ru кіраўнік інфармацыйнага агенцтва Baltnews Андрэй Старыкоў.

Рыжская дума не ўзгадніла заяўку Латвійскага антынацысцкага камітэта на правядзенне паралельнага традыцыйнага маршу антыфашыстаў. Але ўсё ж сваю акцыю яны правялі. Пакуль у цэнтры Рыгі крычалі лозунгі карнікаў, за горадам паміналі тых, хто загінуў ад рук гэтых самых легіянераў «Вафен СС». «Ёсць такое месца — Вентспілскі край, дзе ў снежні 1944-га гэтыя самыя легіянеры «Вафен СС» знішчылі 22 хутары і расстралялі 160 іх насельнікаў — мірных жыхароў Латвіі. Мы проста паклалі кветкі да магіл ахвяр гэтай нацысцкай арганізацыі», — заўважыў сустаршыня Латвійскага антыфашысцкага камітэта Іосіф Корэн. Ён заўважыў, што ўладам «зручней было зрабіць рэверанс менавіта прыхільнікам эсэсаўцаў».

### Пакрываюць карнікаў

Летась Латвія і Літва адмовілі нашай краіне ў прававой дапамозе па крымінальнай справе аб генацыдзе беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. «Яны непасрэдна паказваюць на тое, што гэтыя дзеянні выконваць не будуць, таму што нібыта гэта прынясе шкоду іх нацыянальным інтарэсам», — адзначыў генеральны пракурор Беларусі Андрэй Швед, паведаміла БелТА. Разам з тым ён заўважыў, што «гэтыя дзяржавы не хаваюць таго, што яны як пакрываюць жывых нацысцкіх злачынцаў, так і адмаўляюцца праводзіць следчыя дзеянні па ўстанаўленні злачынстваў, якія ўчынілі карнікі батальёнаў СС, што складаліся з літоўцаў і латышоў».



«Таму гэта яшчэ раз падкрэслівае, што дадзеныя дзяржавы з-за палітыкі, якую яны праводзяць, не будуць прымаць ніякіх дзеянняў, каб выкрыць нацысцкіх злачынцаў», — сказаў Андрэй Швед. Што да вырашэння пытання аб адказнасці нацысцкіх злачынцаў, генпракурор заўважыў, што «мы будзем прымаць усе магчымыя меры да таго, каб яны панеслі адказнасць». «Нагадваю, яны жывуць не толькі на тэрыторыі прыбалтыйскіх дзяржаў, але і больш як дзесяці іншых краін. Мы туды ўжо накіравалі даручэнні або яны цяпер рыхтуюцца, у гэтыя краіны будуць накіраваны адпаведныя дакументы, каб жывыя нацысты ўсё ж паўсталі перад судом», — сказаў ён.

Расследаванне крымінальнай справы будзе весціся да таго моманту, пакуль не будуць сціснуты ўсе акалічнасці, дадаў генпракурор. «Гаворка ідзе аб тым, каб устанавіць усе месцы знішчэння, даследаваць усе дакументы. А гэта тысячы, можа, мільёны старонак дакументаў, мы цяпер з імі працуем», — удакладніў Андрэй Швед.

### Выдуманы наратыў

Беларускі палітолаг Аляксандр Шпакоўскі лічыць, што падобныя дзеянні паказваюць імкненне ўладаў Латвіі перапісаць гісторыю ў выгадным ключы і паднесці людзям выдуманы наратыў. Пра гэта эксперт заявіў у эфіры «Альфа Радыё», каментуючы прапанову мэра Рыгі адмяніць святкаванне 9 Мая. «Нашчадкі тых, хто вінаваты ў адборы крыві ў беларускіх дзяцей для латвійскіх падраздзяленняў СС, пагромах, падпалах і забойствах грамадзянскага насельніцтва, павінны на каленях стаяць 9 Мая, аднак спрабуюць скарыстацца сучаснай сітуацыяй для таго, каб, па-першае, канчаткова зняць са сваіх продкаў груз гістарычнай адказнасці за ўчыненыя злачынствы, па-другое, маючы ў перспектыве мэты фальшывага гістарычнага рэвізіянізму, перагледзець мінулае ў выгадным ключы і паднесці ў будучыні людзям выдуманы наратыў», — заявіў Аляксандр Шпакоўскі.

Па словах палітолага, іншага ад мэра Рыгі чакаць і не варта было.

«Ён ужо неаднаразова выказваўся па грамадска-палітычных пытаннях, спрабаваў здзекавацца з беларускай дзяржаўнай сімволікі, дапускаў у сваім горадзе святкаванне гадавіны ўтварэння латвійскіх падраздзяленняў СС», — звярнуў увагу Аляксандр Шпакоўскі.

Палітолаг лічыць, што Дзень Перамогі — як костка ў горле ў латвійскага ўрада. «Ён не дае ім спакойна дыхаць. Таму робіцца ўсё магчымае, каб усякая абмяжаваць сумленную інфармацыю таго часу. Таму што, абапіраючыся на той гістарычны падмурак, зусім па-іншаму глядзіш на цяперашнія хвалюючыя сітуацыі. Гэта першае, а другое — у сённяшнім палітычным ключы яны [улады Літвы] імкнуцца не дазволіць выкарыстоўваць гістарычную праўду, каб працаваць з людзьмі. Таму што калі ёсць Дзень Перамогі, то як растлумачыць сітуацыю ў дачыненні да Беларусі і Расіі? Як растлумачыць неабходнасць для радавога латыша праз прыцэл глядзець на свайго суседа? Складана, калі мы разам пад адным сцягам некалі перамагалі. Не ўся ж Латвія была ў гэтых нацысцкіх баявых парадах», — заўважыў Аляксандр Шпакоўскі.

**Пётр ДУНЬКО.**

**Даслоўна**

## «ЗЛО БУДЗЕ ПАКАРАНА»

«Мы дакладна ведаем, што журботны звон Хатыні адгукаецца болем у сэрцах не толькі беларусаў, але і мільёнаў людзей у свеце, якія глядзяць на праўду той вайны расплюшчанымі вачыма, разумеюць, што ў нацызму няма нацыянальнасці, і вераць, што зло будзе пакарана, — падкрэсліў у звароце да суайчыннікаў з нагоды гадавіны Хатынскай трагедыі Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.

«Мы будзем рабіць усё, каб захаваць у сучасных і будучых пакаленнях гістарычную памяць аб Вялікай Айчыннай вайне, аб яе сапраўдных героях — вялікіх сынах і дочках шматнацыянальнага савецкага народа-пераможцы», — запэўніў беларускі лідар.

# НА РЫНКУ НЕРУХОМАСЦІ — ЦІШЫНЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



На думку нашага эксперта, **ганаровага старшыні Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць» Мікалая ПРАСТАЛУПАВА,** у сітуацыі, дзе аплата за тавар вядзецца ў рублях, а сумы грошай прывязаны да долара, паўстала сутыкненне сфер інтарэсаў і не толькі. Цяпер на рынку, па словах эксперта, ажыццяўляюцца адзінкавыя здзелкі, якія былі падрыхтаваныя яшчэ да «часу пік». На думку спецыяліста, цэны ў рэкламных праспектах практычна не змяніліся, але пры правядзенні рэальных здзелак выніковыя сумы, як правіла, на 5—10 % меншыя, чым першапачаткова заяўленыя. Рэальныя зніжкі пры продажы аднапакаёвых кватэр складаюць да трох тысяч долараў, двухпакаёвых кватэр — да пяці тысяч долараў. Аднак саміх здзелак на рынку нерэальна мала, і вось чаму.

Справа ў тым, што валюта ў пакупнікоў ёсць, але скарыстацца ёю ў поўнай меры кліенты не могуць. У многіх фінансавых установах часова ўведзены пэўны ліміт па зняцці наяўных грашовых сродкаў іншых краін. Калі грошы ў кліентаў ляжалі «пад падушкай», праблемы наогул не існуе, а вось калі грашовая "падушка бяспекі" знаходзіцца ў банках па дагаворы на ўкладзе ці проста на рахунках...

І яшчэ, як да гэтага часу пакупнік разлічваўся з прадаўцом? Калі проста, схема выглядала так. Кліент браў долары, пераводзіў у рублі і клаў іх на рахунак прадаўца. Потым падпісваўся дагавор куплі-продажу, пасля чаго рублі атрымліваў прадавец кватэры і ў далейшым, як правіла, пераводзіў іх назад у долары. Цяпер гэты механізм з «банкаўскай ячэйкай» практычна не дзейнічае ці працуе праз раз, зноў такі з прычыны банкаўскіх лімітаў. Прадаўцы з пакупнікамі заўсёды адшукаюць механізм перадачы грошай, але ці будзе ён цяпер абсалютна бяспечным?

### Крэдыты на паўзе

Лічыцца, што 80—90 % здзелак на рынку нерухомасці — гэта аперацыі, калі кліент адначасова з'яўляецца прадаўцом і пакупніком жылля. Калі чалавек купляе большую па плошчы кватэру, чым прадае, то яму неабходна мець на руках дадаткова 10—15 тысяч долараў. А калі ўлічыць, што ў кватэры трэба зрабіць рамонт, — проста неабходныя ўсе 25 тысяч. Дзе іх узяць? Правільна, крэдыт.

Вось толькі «паход» на сайты банкаў сёння — суцэльнае расчараванне. Не паспееш клікнуць на патрэбную ўкладку, як перад вачыма ўсплывае папярэджанне: «Праграмы крэдытавання прыпынены».

Большасць камерцыйных банкаў яшчэ паўгода таму актыўна спансіравала будаўніцтва, менш актыўна падтрымлівала «другаску» і прапаноўвалі партнёрскія праграмы з двума дзясяткамі забудоўшчыкаў. Амаль усе яны з канца лютага прыпынілі прыём дакументаў як на новыя крэдыты, так і на павелічэнне лімітаў ранейшых пазык.

Найбуйнейшыя сістэмныя банкі рэальна дапамагаюць толькі «чаргавікам» і толькі па 240-м указе. Па сутнасці, на рынку застаўся працаваць адзін Беларусбанк. Праўда, тут свае нюансы. «Іпатэка Экспрэс», якую банк прапаноўваў і раней, падрасла да 23 % (супраць восеньскіх 21 %). У астатнім усё як і было: да 20 гадоў, пад заклад той самай кватэры (можа спатрэбіцца яшчэ і паручыцель), мужа/жонку можна ўключаць у сукупны даход, датэрмінова пагасіць таксама можна. Прапанова распаўсюджваецца толькі на гатовае жыллё.

Мы паспрабуем узяць нашы 25 тысяч долараў па курсе. Паўгода таму гэта было 60 з лішнім тысяч рублёў, цяпер — 80 тысяч з капейкамі (калі па Нацбанку). Уявім, што іншых крэдытаў у нас няма. Каб атрымаць 80 тысяч рублёў у крэдыт, сярэдні даход павінен складаць не менш за 2668 рублёў. Гэта арыенціровачны разлік. Тады памер плацяжу па крэдыце складзе 1868 рублёў у месяц. Гэта максімальная сума, потым яна будзе змяншацца. Стаўка можа павялічыцца, бо крэдыт залежыць ад стаўкі рэфінансавання...

### Будуць браць кватэры без рамонту

**Намеснік начальніка аддзела кансалтынгу і аналітыкі групы кампаній «Твая сталіца» Андрэй ЧАРНЫШОЎ** лічыць, што крызіс, выкліканы каранавірусам, паказаў — логіка заўсёды прыкладна аднолькавая: як толькі сітуацыя стабілізуецца, людзі вырашаюцца на здзелкі з нерухомасцю. І, вядома, яны глядзяць на крэдытныя прадукты. Вяртанне «Іпатэкі Экспрэс» ад Беларусбанка ў 2021 годзе са стаўкай у 20—21 %, з аднаго боку, актывізавала рынак (бо крэдытавання ў другасны рынак мала хто чакаў), але з другога — знізіла долю пакупнікоў з крэдытамі роўна напалову.

Напрыклад, за люты здзелкі з прыцягненнем крэдыту склалі толькі 12 % ад іх агульнай колькасці. Пры гэтым усе крэдытныя лініі былі адкрытыя для кліентаў да 24 лютага. А ў сакавіку такіх здзелак у гэтага агенцтва ўжо зусім не было.

Попыт на кватэры ў Мінску ёсць і цяпер, мяркуе спецыяліст. Прычым ён прыкметна не аслабеў. Проста ў адных патэнцыяльных пакупнікоў ён фінансава забяспечаны (яны гатовыя хоць сёння вылажыць грошы), а ў іншых — адкладзены. Так, ім трэба памяняць кватэру, палепшыць свае ўмовы, і яны былі гатовыя да гэтага яшчэ ў лютым, але пасля таго як курс долара вырас, планы прыйшлося скарэкціраваць. Гэта значыць, проста цяпер гэтыя людзі не могуць разлічыцца, але надоўга думку пра гэта не адкладваюць. Яны тое зробяць, калі будуць прыдатныя ўмовы. І нейкія зразумелыя перспектывы.

А што з прагнозам на заўтра? На думку аналітыка, здзелкі з прыцягненнем крэдытаў праходзіць будуць, але ў значна меншай колькасці (адносна таго, да чаго нас прывучыў мінулы год). І не з-за таго, што банкі не прапаноўваюць варыянты. Нават калі ўсе банкі цяпер запусцяць свае прадукты з рыначнай стаўкай, чэргаў у іпатэчных аддзелах не здарыцца. Таму што сёння пакупнікі будуць проста асцерагацца браць на сябе цяжар, які можа стаць непасільным.

Асноўны ж попыт засяродзіцца на кватэрах ніжэйшага цэнавага сегмента кожнага з класаў якасці. Калі мы бяром тыпавыя панэльныя аднапакаёвыя кватэры са свежым рамонтам, але без вынаходстваў, то пры разбежцы цэн ад 40 тысяч долараў да 45 тысяч на курсе браць будуць тыя, што таннейшыя. За чужы, хай і вельмі добры рамонт, людзі сёння пераплачваць не захочуць, лічыць спецыяліст.

Сітуацыя змянілася, але яна такая, якая ёсць. Гэта як з надвор'ем: адным сваім жаданнем або ўпартасцю наступленне зімы ды халадоў не спыніць, і ўжо тым больш не павярнуць назад. Проста трэба тое прыняць і адпаведна апранацца. А яшчэ — верыць, што пацяплее.

Зразумела, што ёсць прадаўцы, якія не сочаць за сітуацыяй, і таму будуць трымаць цэны да апошняга, дзівячыся прапановам аб зніжцы. Але рана ці позна і яны зразумеюць, што аднаго толькі іх жадання для продажу кватэры мала. Ёсць рыначныя законы цэнаўтварэння, і, згодна з імі, сёння з-за курсу долара і саслабелай пакупніцкай здольнасці цэны, сфарміраваныя ў доларах у лютым, ужо няжыццяздольныя. Цяпер час пакупніка, і менавіта ён вызначае, што купляць і за колькі. І гэта не ўльтыматыўная, а вымушаная пазіцыя пакупнікоў, якія хочуць набыць кватэру, але па старых цэнах ужо не могуць гэтага зрабіць.

### Дзе мяжа падзення цаны?

У любым выпадку, прадаўцы яшчэ ні разу не апускалі цэннік так, каб цалкам «кампенсаваць» пакупніку рост курсу, лічыць Андрэй Чарнышоў. Таму чакаць, што трохпакаёвая кватэра, якая аб'ектыўна каштавала 76 тысяч долараў па курсе, раптам стане прадавацца за 55 тысяч ці каля таго, не варта. Але да 68 тысяч у эквіваленце (калі адштурхоўвацца ад цяперашняй сітуацыі) яна абавязкова прыйдзе. Ведаючы гэтую формулу, вы можаце самастойна падлічыць, якой павінна быць мінімальная зніжка, для таго, каб вашай кватэрай зацікавіліся пакупнікі.

На бягучы момант прадаўцы ўжо гатовыя на торг у межах 8 %, што якраз адпавядае курсу, які вырас прыкладна на 27 %. І падобныя кватэры знаходзяць сваіх пакупнікоў вельмі хутка.

Аднак з улікам таго, што сёння мы назіраем больш складаную і шматфактарную сітуацыю, чым тыя, што былі ў мінулыя гады, падобную зніжку нельга назваць выніковай для таго, каб актыўнасць у поўнай меры вярнулася на рынак.

### Да чэрвеня сітуацыя праясніцца

На нашу просьбу аб доўгатэрміновым прагнозе развіцця рынку нерухомасці ў краіне эксперт Мікалай Прасталупаў адзначыў, што ўсе мы спадзяёмся — бліжэй да лета сітуацыя, звязаная з Украінай, завершыцца. Аднак у два бліжэйшыя месяцы на рынку будзе назірацца ўпэўненае зніжэнне цэн на жыллё. Параіўшыся, спецыялісты рынку нерухомасці прыйшлі да адзінага меркавання — хутчэй за ўсё, у канцы мая адбудзецца выніковае падзенне цэн на рынку другаснага жылля на ўзроўні 10—15 % у параўнанні з цэнамі, якія былі ў канцы лютага. Даваць больш доўгатэрміновы прагноз нерэальна, таму што летам назіраецца зацішша ў сферы гандлю нерухомасцю.

Грошы

## АЖЫЯТАЖ ВАКОЛ ДОЛАРА СТВАРАЮЦЬ ШТУЧНА

**Найбуйнейшы банк нашай краіны папярэджвае, што для атрымання доступу да персанальных даных ашуканцы цяпер выкарыстоўваюць і тэхналогіі падмены нумара тэлефона.**

Справа ў тым, што апошнім часам грамадзянам Расіі ўсё часцей сталі паступаць званкі невядомых асоб ад імя розных банкаў з нумароў тэлефонаў, якія нібыта належаць ААТ «ААБ Беларусбанк» (напрыклад, +375172188431).

У дадзеным выпадку ашуканцы выкарыстоўваюць тэхналогіі падмены нумара, з дапамогай якой у выклікаючага абанента падчас уваходнага званку адлюстроўваецца нумар, які належыць банку. Пры гэтым невядомыя, выдаючы сябе за супрацоўнікаў розных банкаў, спрабуюць стварыць ажыятажны попыт вакол замежнай валюты ў Расійскай Федэрацыі.

Спецыялісты гэтай фінансавай установы звяртаюць увагу на тое, што сапраўдныя супрацоўнікі «Беларусбанка» падобных званкоў не ажыццяўляюць!

Яшчэ раз работнікі банка нагадваюць, што калі вы сутыкнуліся з такой сітуацыяй (нават калі вам патэлефанавалі з нумара, які належыць банку), не паведамляйце рэквізіты сваёй карткі (нумар, тэрмін дзеяння, CVC2/CVV2-код). Ні ў якім выпадку таксама не варта перадаваць іншыя канфідэнцыяльныя звесткі: пароль 3D-Secure, лагін і пароль, даныя для ўваходу ў сістэму «Інтэрнэт-банкінг», код рэгістрацыі SMS-банкінгу, любыя аднаразовыя SMS-коды, якія накіроўваюцца банкам, і іншыя звесткі. У дадзеным выпадку неабходна неадкладна спыняць размову.

Каб паведаміць аб ашуканскіх дзеяннях, з якімі вы сутыкнуліся, трэба запоўніць спецыяльную форму на сайце банка.

Надвор'е

## ВЯСНА. КАПРЫЗНАЯ І ПЕРАМЕНЛІВАЯ

### Дастаткова халадна будзе нават у першыя дні красавіка

**Аб гэтым паведаміла сёння на прэс-брыфінгу першы намеснік начальніка рэспубліканскага гідраметэацэнтра Святлана КУЗЬМІЧ. Паводле яе слоў, часовае сакавіцкае пахаладанне абсалютна не перакрэслівае тэндэнцыі да глабальнага пацяплення на планеце. А вясна, яна такая — сёння закруціць завіруха, а заўтра прыйдзе амаль летняе надвор'е.**

А пакуль у нас з цяплом праблемы. Так, у канцы сакавіка і ў пачатку красавіка ў нашай краіне будзе зусім не горача, расказала **начальнік службы метэаралагічных прагнозаў Белгідрамета Мінпрыроды Таццяна ЧАТЫРКО.**

Справа ў тым, што перыяд сухога надвор'я ў Беларусі працягваўся два тыдні. Па словах сіноптыка, цяпер ён падыходзіць да канца. Паступова антыцыклоны, якія фарміравалі надвор'е, пачынаюць слабець, і праз тэрыторыю нашай краіны сталі прабівацца атмасферныя франты. Таму колькасць аблокаў і ападкаў будзе паступова павялічвацца, а тэмпературны фон — паніжацца і набліжацца да кліматычнай нормы, а ў канцы месяца будзе нават крыху ніжэйшы за норму.

Амаль што парадокс — ночы пры гэтым будуць не такімі ўжо халоднымі — ад мінус 5 градусаў да 3 цяпла, але ўдзень пры больш шчыльнай воблачнасці паветра ўжо не будзе праграявацца так інтэнсіўна, як цяпер. Таму ў найбольш цёплыя дні астатняй часткі гэтага тыдня, у пятніцу і суботу, тэмпература паветра па краіне будзе вагацца ад плюс 7 да плюс 16 градусаў па поўдні краіны. Пры гэтым ужо ўдзень у нядзелю будзе ўсяго 1—8 градусаў вышэй за нуль, толькі па поўдні краіны на пару градусаў цяплей. Пачне ўзмацняцца вецер, таму адчувацца тэмпература будзе крыху ніжэйшай.

Па доўгатэрміновых прагнозах сіноптыкаў, у пачатку наступнага тыдня ў Беларусь пачнуць прабівацца чарговыя атмасферныя франты, якія будуць прычыняй некамфортнага ветранага надвор'я з ападкамі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу. Тэмпературны фон пачне паніжацца. Да канца сакавіка чакаецца няўстойлівае надвор'е з тэмпературай ніжэй за кліматычную норму. Паводле папярэдняга прагнозу, халоднае надвор'е захаваецца і ў першыя дні красавіка.

**Матэрыялы падрыхтаваў Сяргей КУРКАЧ.**

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА
24 САКАВІКА 2022 г.
ЧАЦВЕР
№ 6 (15929)
Выдаецца з 21 красавіка 1921 года

Маладыя імёны

## Ганна ТРАЎКОВА:

# «Алімпійскія гульні надалі мне матывацыі»



**Беларуская спартыўная гімнастыка сёння, нібыта птушка-фенікс, перажывае адраджэнне. Гучныя дасягненні Вольгі Корбут, Нэлі Кім, Віталя Шчэрбы ўжо сталі гісторыяй. Але спорт жыве і сёння. І паступова крок за крокам набліжаецца да былой славы. Адказнасць за гэта ляжыць на плячах маладых, перспектыўных спартсменаў. Адна з іх — Ганна Траўкова, якая пераймае вопыт знакамітай школы легендарнага трэнера Рэнальда Іванавіча Кныша. Ганна — пераможца шматлікіх рэспубліканскіх турніраў і ўдзельніца міжнародных стартаў. У мінулым сезоне яна перамагла на чэмпіянаце Беларусі ў шматбор'і і вольных практыкаваннях, стала чэмпіёнкай у камандным турніры. Але самай галоўнай падзеяй для Ганны сталі Алімпійскія гульні ў Токіа, дзе яна замяніла Настассю Алістратаву. Дзяўчына не разгубілася і зрабіла ўсё, што ў яе сілах. Пасля вынесла пэўныя ўрокі і пачала рыхтавацца да новага сезона, які ўжо пачынаецца. Пра свае спартыўныя планы Ганна Траўкова расказала «Чырвонцы. Чырвонай змене».**

***— Раскажы, калі ласка, чаму сярод усіх відаў спорту ты выбрала менавіта спартыўную гімнастыку?***

— Мне было гадоў пяць, калі тата прывёў у секцыю. Проста каб я магла фізічна развівацца. Але не скажу, што мне падабалася. Я саромелася туды хадзіць. І гэта не дзіўна: маленькая пяцігадовая дзяўчынка ў вялікай спартыўнай зале. Але з часам я прывыкла, і, самае галоўнае, палюбіла гімнастыку. Калі на першых спаборніцтвах заняла трэцяе месца, адчула, што ў будучыні хачу быць першай. А ў 2015 годзе на спартакіядзе школьнікаў заваявала пяць медалёў, адабралася на Еўрапейскі юнацкі фестываль ў Тбілісі. І так, у 14 гадоў, мая спартыўная кар'ера выйшла на новы ўзровень. А некалі страшная спартыўная зала стала другім домам.

Гімнастыка зачапіла мяне сваёй разнастайнасцю: брусы, бервяно, апорныя скачкі і вольныя практыкаванні. І кожная дысцыпліна па-свойму цікавая, да кожнага снарада патрабуецца свой падыход. Дзякуючы гэтаму мы пастаянна ўсебакова развіваемся. Больш за ўсё я люблю скакаць, абажаю вольныя практыкаванні, вельмі падабаюцца акрабатычныя і харэаграфічныя элементы. Магчыма, пасля гімнастыкі буду займацца танцамі. Пакуль на гэта не хапае часу, таму проста люблю глядзець, як людзі танцуюць. А вось самы складаны снарад для мяне — гэта брусы. Ён вельмі капрызны і патрабавальны. Як паказвае вопыт, калі прапусціць некалькі трэніровак, цяжэй за ўсё адпрацаваць тэхніку менавіта на брусах. Лішнія грамы таксама асабліва адчуваюцца на гэтым снарадзе.

*(Заканчэнне на 4-й стар. «ЧЗ».)*

Увага, конкурс!

# «АДЗІНАЯ КРАІНА — АДЗІНЫ НАРОД»




**У Год гістарычнай памяці маладзёжны дадатак «Чырвонка. Чырвоная змена» да найстарэйшага беларускамоўнага выдання «Звязда» сумесна з Беларускім рэспубліканскім саюзам моладзі аб'яўляе творчы конкурс для школьнікаў і студэнтаў, маладых спецыялістаў пад назвай «Адзіная краіна — адзіны народ».**

Які сэнс укладвае моладзь у гэтыя словы? Што нас усіх аб'ядноўвае? Агульная спадчына? Несумненна. Магчыма, вашы родныя былі сведкамі ці ўдзельнікамі пэўных гістарычных падзей ці вам самім ужо давялося спрычыніцца да іх? Адна мова? Так. Ці праўда, што яна — адзін з нацыянальных трэндаў сярод цяперашняй моладзі? Можа быць, наведванне нейкіх мясцін, помнікаў — архітэктурных ці прыродных — зрабіла на вас вялікае ўражанне, прымусіла па-іншаму зірнуць на іх месца ў нашым жыцці? Што вы разумееце пад паняццем «патрыятызм»?

Выкажыце сваю асабістую пазіцыю па гэтых пытаннях, пра стаўленне равеснікаў да тых ці іншых праблем, якія ўздымаюцца ў грамадстве, у тым ліку найперш у сферы маладзёжнай палітыкі, раскажыце пра іх асабісты ўнёсак у тую ці іншую справу.

Не пішыце матэрыялы агульнымі словамі, не разважайце пра ўсім вядомае. Раскажыце — цікава! — пра канкрэтную падзею, мерапрыемства, якое арганізавала моладзь, каб выказаць неабыякавасць да той ці іншай праблемы ці сітуацыі. Знайдзіце маладых людзей, якія праз справы паказалі такі прыклад.

Па выніках конкурсу пераможцы атрымаюць памятныя прызы. Конкурс будзе доўжыцца да 31 жніўня (дата адпраўкі матэрыялаў). Найлепшыя творчыя работы (у залежнасці ад колькасці, якая паступіць) «Чырвонка. Чырвоная змена» можа працягваць друкаваць і надалей. Размяшчаць іх плануецца або ў маладзёжным дадатку, або (і) на сайце «Звязды».

Матэрыялы на конкурс можна дасылаць на адрас zmena2022@mail.ru або на паштовы (220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, рэдакцыя газеты «Звязда») з пазнакай «Адзіная краіна — адзіны народ».

*(Заканчэнне на 2-й стар. «ЧЗ».)*

Знайсці сябе

# ДУША НА ДАЛОНІ

## Хто выбірае прафесію, якая лечыць

**Сучасны свет развіваецца на шалёнай хуткасці. Каб адпавядаць тэмпам жыцця, чалавеку трэба быць гнуткім, мець шматлікія сацыяльныя кантакты і ўцягваць інфармацыю як губка. У гэткіх умовах наша свядомасць не заўсёды спраўляецца з нагрузкамі. Менавіта таму стала натуральным жаданне людзей звяртацца па дапамогу да псіхолагаў — спецыялістаў, якія дапамагаюць аптымізаваць псіхічны стан і аднавіць жыццёвыя рэсурсы.**

### ЗНАЙСЦІ АДКАЗЫ НА ПЫТАННІ



У апошнія дзесяцігоддзі колькасць студэнтаў, якія спецыялізуюцца ў галінах псіхалогіі, значна вырасла. Ва ўніверсітэтах па ўсім свеце гэтая спецыяльнасць часта ўваходзіць у пяцёрку самых папулярных. Зразумець, чаму ўсё больш маладых людзей аддаюць перавагу такой адказнай і глыбокай прафесіі, нам дапаможа **Вераніка ГОРБАЧ, студэнтка другога курса факультэта псіхалогіі інстытута псіхалогіі БДПУ імя Максіма Танка**.

— Жаданне стаць спецыялістам у гэтай галіне з'явілася ў мяне ў сярэдняй школе разам з усведамленнем, што псіхалагічны стан чалавека такі ж важны, як і яго фізічнае здароўе. Колькі сябе памятаю, заўсёды любіла слухаць людзей і даваць ім парады. У шостым класе пачала размаўляць са школьным педагогам-псіхолагам.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «ЧЗ».)*

«ШАГ» на хвалі часу

# ВЕДАЦЬ І ПАМЯТАЦЬ СВАЮ ГІСТОРЫЮ!

## Новы імпульс у ваенна-патрыятычнай рабоце ў школе

**Пры правядзенні мерапрыемстваў з моладдзю фармалізм недапушчальны. Нельга гэтым займацца толькі дзеля «птушачкі» ці справаздачы. Трэба шукаць новыя формы і метады работы, якія адпавядаюць сучасным рэаліям. Пра гэта на выніковай калегіі Міністэрства адукацыі казалі намеснік прэм'ер-міністра Ігар Петрышэнка і міністр адукацыі Андрэй Іванец.**

У бягучым навучальным годзе ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі працягваецца рэалізацыя інфармацыйна-адукацыйнага праекта «Школа Актыўнага Грамадзяніна». Гэта адзін з самых маштабных і вядомых рэспубліканскіх праектаў, які стаў новым імпульсам у правядзенні ідэалагічнай і ваенна-патрыятычнай работы ў школе.

У 192-й мінскай гімназіі імкнуцца зрабіць кожнае мерапрыемства ў рамках ШАГа максімальна карысным і цікавым для дзяцей. Напярэдадні хатынскай трагедыі на сустрэчу з дзевяцікласнікамі быў запрошаны **Аляксандр ПЛАВІНСКІ, падпалкоўнік запаса ўнутраных войскаў МУС, аўтар кніг «Падпольшчыкі без грыфа «сакрэтна», «Латыгольскі летапіс», «Латыгольская царква» і «Курапаты — каля вытокаў гістарычнай сенсацыі»**.

— Усё, што напісана пра Хатынь у школьным падручніку па гісторыі для 9 класа, змясцілася фактычна ў некалькіх абзацах, — з сумам канстатуе Аляксандр Плавінскі. — На жаль, некаторымі сучаснымі гісторыкамі многія факты, якія датычацца ваенных падзей, фальсіфікуюцца, прыпадносяцца пад іншым ракурсам. Трэба выкрываць і не допускаць фальсіфікацыі гісторыі...

З аповеду Аляксандра Плавінскага школьнікі даведаліся пра палітыку генацыду і перадгісторыю з'яўлення на тэрыторыі Беларусі карных фарміраванняў з ліку калабарантаў. Ключавой падзеяй стаў візіт у Мінск аднаго з галоўных дзеячаў нацысцкай Германіі рэйхсфюрара СС Генрыха Гімлера 14—15 жніўня 1941 года. Прыезд найбольш уплывовай фігуры Трэцяга рэйха быў звязаны з вывучэннем вопыту рэалізацыі асабістага загаду Гітлера па знішчэнні вялікіх



Аляксандр Плавінскі: «Васюру судзілі і пакаралі за яго шматлікія злачынствы толькі ў 1986 годзе...»

груп яўрэяў. Генеральны камісар Генеральнай акругі Беларусь гаўляйтар Вільгельм Кубэ вырашыў парадаваць высокага госця «захапляльным відовішчам» і адначасова прадэманстраваць ужо адладжаную, дакладную сістэму знішчэння. Гімлер ахвотна прыняў прапанову, рэйхсфюрар СС жадаў асабіста разабрацца ў метадах масавых расправаў, якія выклікалі некаторыя скаргі ў арміі.

Сцвярджаюць, што да гэтага дня Гімлеру ніколі не даводзілася назіраць асабіста, як забіваюць чалавека. Агульную карціну пакарання часткова можна аднавіць са слоў сведкаў, якія прысутнічалі падчас расстрэлу. Яўрэяў ударамі прымушалі саскокваць у яму і загадвалі легчы на жывот, пасля чаго 8—10 катаў стралялі адначасова ў галаву ці шыю, затым наступную партыю людзей прымушалі саскокваць і класціся зверху на толькі што забітых.

Ніхто не чакаў, што Гімлеру стане блага ад убачанага. Дзве жанчыны былі толькі параненыя, а не забітыя адразу. Калі рэйхсфюрар СС убачыў, што няшчасныя прагавіць вярушыцца і клічуць на дапамогу, ён, трасучыся ў істэрыцы, закрычаў на эсэсаўцаў, абвінавачваючы іх у дрэннай стральбе. Пасля гэтага Гімлер сказаў, што нямецкія салдаты не павінны псаваць сваю псіхіку і пэцкаць рукі крывёй, а карныя і расстрэльныя акцыі, уся чарнавая работа былі даручаны мясцовым і запрошаным у Беларусь здраднікам з Літвы, Латвіі і Украіны.

Другім літоўскім паліцэйскім батальёнам, які дзейнічаў спачатку на тэрыторыі Літвы, а затым і Беларусі, камандаваў Антанас Імпулявічус, празваны «мінскім мясніком». Асаблівай бесчалавечнасцю Імпулявічус і яго падначаленыя вылучыліся пры вырашэнні «яўрэйскага пытання» ў мінскім гета.

Таксама госць расказаў школьнікам пра хатынскага ката. У знішчэнні Хатыні ўдзельнічалі штурмбрыгада СС «Дзірлевангер» і 118-ы батальён нямецкай дапаможнай ахоўнай паліцыі. Але асноўную працу рабілі апошнія. 118-ы паліцэйскі батальён складаўся пераважна з паліцаяў-украінцаў, а кіраваў карнай аперацыяй былы старшы лейтэнант Чырвонай Арміі, які перайшоў на бок Германіі, Рыгор Васюра. У Хатыні былі спалены жыўцом 149 чалавек, у тым ліку 75 дзяцей. А Васюру судзілі і пакаралі за яго шматлікія злачынствы толькі ў 1986 годзе. Да гэтага часу кат паспяхова выдаваў сябе за ветэрана вайны, даслужыўся да намесніка



Міхаіл Паваляеў папаўняе кабінет новымі прадметамі з цікавай гісторыяй, элементамі вайсковай формы, картамі, захапляльнай літаратурай.

дырэктара саўгаса ў Кіеўскай вобласці, за сваю працу быў некалькі раз узнагароджаны. Загубіла Васюру тое, што ў 1985 годзе, на 40-годдзе Перамогі, ён стаў патрабаваць сабе ордэн Айчыннай вайны. У архівах служачыя знайшлі, што Васюра да гэтага часу лічыцца зніклым без вестак. Рашэнне суда было непахіснае — найвышэйшая мера пакарання праз расстрэл.

У школьнай праграме ўсе гэтыя важныя падрабязнасці пра тое, што адбывалася на тэрыторыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, не згадваюцца. Увогуле, часу на гэты гістарычны перыяд у вучэбнай праграме адводзіцца катастрафічна мала. Таму аповед Аляксандра Плавінскага пра падзеі амаль васьмідзесяцігадовай даўніны школьнікаў зацікавіў. А запрасіў госця ў гімназію **кіраўнік ваенна-патрыятычнага выхавання, палкоўнік у адстаўцы, ветэран вайны ў Афганістане Міхаіл ПАВАЛЯЕЎ**. Кіраўніцтва гімназіі кажа, што ім з Міхаілам Генадзьевічам вельмі пашанцавала. Акрамя цікавага прафесійнага і жыццёвага досведу, якімі той гатовы дзяліцца з дзецьмі, у яго ёсць яшчэ і грамадзянская адукацыя: ён выкладчык гісторыі. З кабінета ваенна-патрыятычнага выхавання цяжка хутка сысці, таму што позірк увесь час выхоплівае штосьці цікавае. Педагог пастаянна папаўняе яго новымі прадметамі з гісторыяй, элементамі вайсковай формы, картамі, захапляльнай літаратурай, работамі Студыі ваенных мастакоў.

— Гарадская арганізацыя ветэранаў вайны ў Афганістане перадала нам радыёстанцыю, якой карысталіся падчас знаходжання ў гэтай краіне савецкія вайскоўцы. А вось у мяне ў руках шахматны механічны гадзіннік 1954 года выпуску. Ён выкарыстоўваўся падчас фінальнай сустрэчы зборных ГДР і БССР у Мінскім акружным Доме афіцэраў, якая адбылася ў 1961 годзе, — не без гонару кажа Міхаіл Паваляеў. — А вось карта, якая раней мела грыф «абсалютна сакрэтна» — пра групіроўку войскаў на тэрыторыі Беларускай ваеннай акругі прыблізна ў 1985 годзе. Пагледзіце, наколькі наша краіна далёка адышла ад той ступені мілітарызацыі, што была ў савецкія часы. Калі раней набенаслужваўся быў кожны сорак трэці жыхар Беларусі, то сёння — кожны сто сорак шосты.

Вялікую цікавасць уяўляе так званая «Карта памяці», прызначаная для заняткаў па ваенна-патрыятычнай тэматыцы ў рамках вучэбнай праграмы аб'яднання па інтарэсах «Мая Айчына».

— Яна аформлена на стандартнай вучэбнай фізічнай карце Беларусі, таму школьнікі паралельна вывучаюць геаграфічную карту краіны, дзе яны жывуць, набываюць навыкі работы па тапаграфіі, знаёмяцца з паняццем «маштаб карты» і вывучаюць пытанні ўвекавечвання памяці абаронцаў Айчыны і ахвяр Вялікай Айчыннай вайны. На карту нанасіцца мемарыяльныя комплексы рэспубліканскага значэння, ваенна-гістарычныя музеі і музейныя комплексы, воінскія пахаванні, месцы масавага знішчэння людзей, канцэнтрацыйныя лагеры для ваеннапалонных і цывільнага насельніцтва, партызанскія зоны і базы, палявыя аэрадромы, пошукавыя аб'екты, адпрацаваныя 52-м асобным спецыялізаваным пошукавым батальёнам Міністэрства абароны за перыяд з 1995 да 2021 года, — расказвае Міхаіл Паваляеў.

Дзякуючы кіраўніку па ваенна-патрыятычным выхаванні ў гімназіі праводзяцца пазнавальныя гістарычныя квэсты і віктарыны на самыя розныя тэмы, літаратурныя віктарыны ваеннай-патрыятычнай накіраванасці, ладзяцца экскурсіі ў Музей Вялікай Айчыннай вайны, Мемарыяльны музей-майстэрню Заіра Азгура, Цэнтральны музей Унутраных войскаў МУС, музей-самалёт воінскай славы Ан-26РТ у Мачулішчах... Гімназія супрацоўнічае з ваенным факультэтам БДУІР і ваенна-тэхнічным факультэтам БНТУ. У найбліжэйшы час плануецца, што на сустрэчу з гімназістамі прыйдуць ваенны журналіст, паэт, член Саюза пісьменнікаў Беларусі Андрэй Бокза і палкоўнік у адстаўцы, эксkамандзір касмічнай выпрабавальнай часці касмадроме «Байканур» Іван Умінскі. Менавіта ён тэсціраваў савецкія касмічныя і балістычныя ракеты. Праслужыў на касмадроме «Байканур» больш за 20 гадоў. У 1976 годзе за паспяховае выкананне задання савецкага ўрада Іван Умінскі быў узнагароджаны ордэнам Кастрычніцкай рэвалюцыі. Улічваючы, што сучасныя дзеці даўно не марaць стаць касманаўтамі і ўвогуле мала што ведаюць пра асваенне космасу, можна не сумнявацца, што такі госць іх абавязкова зацікавіць...

**Ганна НОВІК.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**

# «АДЗІНАЯ КРАІНА — АДЗІНЫ НАРОД»

## Абавязковыя ўмовы, якім павінны адпавядаць конкурсныя работы:

1. Толькі на беларускай мове.
2. Тэксты дасылаюцца ў фармаце RTF.
3. Кожная ілюстрацыя ці фотаздымак да тэксту дасылаецца АСОБНЫМ прымацаваным файлам.
4. Аб'ём конкурсных работ — не больш за 8 тысяч знакаў (з прабеламі).
5. Колькасць работ ад аднаго аўтара не абмяжавана, аднак пры вялікай колькасці конкурсных работ кожнаму ўдзельніку (пры ўмове належнай якасці матэрыялаў і адпаведнасці ўмовам конкурсу) даецца па адным шанцы.
6. Конкурс разлічаны на вучняў старшых класаў, студэнтаў, маладых спецыялістаў.



7. Жанр любы, але гэта павінна быць толькі проза (нататка, рэпартаж, эсэ, замалёўка, інтэрв'ю).
8. Пажадана, каб матэрыял быў напісаны спецыяльна для конкурсу. Вялікая просьба не дасылаць школьных сачыненняў, рэфератаў (і па форме, і па змесце), асабліва падрыхтаваных раней. На пачатку тэксту павінен быць загаловак (назва конкурсу не з'яўляецца такім), напрыканцы — імя і прозвішча аўтара.
9. Аўтар абавязаны пазначыць свае пашпартныя звесткі (нумар і серыя, ідэнтыфікацыйны нумар, кім і калі быў выдадзены дакумент, імя, імя па бацьку, прозвішча) і хатні паштовы адрас (індэкс, населены пункт, вуліца, дом). Гэтыя звесткі будуць патрэбны для бухгалтэрыі ў выпадку, калі работа будзе надрукавана ў газеце. ТОЛЬКІ яны падаюцца аўтарам на БЕЛАРУСКАЙ і РУСКАЙ мовах. У выпадку, калі ў маладога ці юнага аўтара яшчэ няма пашпарта, вышэйназваныя звесткі падаюцца на аднаго з бацькоў, настаўніцу, кіраўніка гуртка (звесткі з пасведчання аб нараджэнні для бухгалтэрыі не падыходзяць).
10. Апроч таго, аўтар паведамляе СВОЙ нумар мабільнага або хатняга тэлефона, каб рэдакцыя ў выпадку неабходнасці магла аператыўна з ім звязацца.
11. Павінна быць пазначана поўная колькасць гадоў аўтара на момант адсылання конкурснай работы, нумар школы і класа.
12. Аўтар павінен паведаміць крыху дадатковай інфармацыі пра сябе (10—15 радкоў) у адвольнай форме. Напрыклад, якія і ў чым мае дасягненні (вучоба, спорт, мастацтва і г. д.), чым захапляецца ў вольны час, кім марыць стаць у будучыні і інш.
13. Калі дасланыя матэрыялы не падыходзяць да друку, яны не рэцэнзуюцца.
14. Пра канчатковую дату падвядзення вынікаў творчага конкурсу рэдакцыя паведаміць дадаткова. Адсочваць публікацыю матэрыялаў павінны самі аўтары або іх куратары (бацькі, настаўнікі, кіраўнікі гурткоў).

Зычым усім творчых поспехаў і перамог!

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

# ДУША НА ДАЛОНІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)

І ўжо тады мне прыйшла думка, што хачу вывучаць псіхалогію, а ў далейшым — і займацца ёй. Мяне натхняла ідэя, што магу дапамагаць іншым паляпшаць іх эмацыянальны стан. Пачала чытаць кнігі па псіхалогіі, многія з якіх аказвалі на мяне вялікае ўражанне. Напрыклад, кніга Міхаіла Лабкоўскага «Хачу і буду» сапраўды дапамагла адказаць на некаторыя важныя пытанні і палюбіць сябе. У выпускным класе я мэтанакіравана рыхтавалася да паступлення менавіта на псіхолага. Рада, што мама і блізкія падтрымалі маё імкненне, — расказвае Вераніка.

У працэсе навучання вялікая ўвага ўдзяляецца базавым псіхалагічным дысцыплінам, без якіх немагчыма абысціся будучым спецыялістам. Разам з гэтым асноўны ўпор — на практычныя навыкі стасункаў з людзьмі. У далейшым на такой адукацыйнай базе можна паспяхова развівацца ў любым кірунку.

— Няхай я вучуся толькі на другім курсе, але ўжо разумею, наколькі мне падабаецца псіхалогія. Я пачала лепш разумець сябе і іншых. Ад усведамлення гэтага хочацца паглыбляцца ў вучобу ўсё больш. У інстытуце мы вывучаем шэраг цікавых дысцыплін: некаторыя непасрэдна звязаны з будучай прафесіяй,



напрыклад, агульная псіхалогія, а некаторыя — толькі часткова, але таксама патрэбны для агульнай эрудзіраванасці. Думаю, мы з аднагрупнікамі прыкладзём усе намаганні і справімся з засваеннем такой няпростай, але важнай спецыяльнасці, — кажа суразмоўніца.

Псіхолаг — спецыяліст, які лечыць душу. Пры гэтым ён не прызначае пацыенту медыкаменты, а выкарыстоўвае толькі спецыяльныя псіхалагічныя тэхнікі. Аднак адказнасць, якую ён бярэ на сябе, ніколькі не меншая, чым урачэбная. Бо ўсе мы ведаем, што душа існуе, і ўсе адчуваем, як не соладка даводзіцца, калі яна баліць. Таму работа псіхолага — справа вельмі тонкая і карпатлівая.

Кола сфер, у якіх можна працаваць з псіхалагічнай адукацыяй, на сённяшні дзень вельмі шырокае і разнастайнае. Акрамя псіхалогіі, ёсць цяга да медыцыны? Становіцеся псіхіятрам. Цікавіць, як уладкаваны мозг і наша мысленне? Вас чакае нейракагнітыўная псіхалогія.

— Каб паглыбіцца ў спецыфіку будучай работы, акрамя вучобы я хацела б прайсці яшчэ і курсы па якіх-небудзь пэўных напрамках. Яшчэ не ведаю, чым буду займацца пасля заканчэння ВНУ: можа, стану псіхолагам-кансультантам і адкрыю ўласны кабінет, а можа ўладкуюся бізнес-псіхолагам у якую-небудзь кампанію, — падзялілася планамі студэнтка.

### ВАЖНАЯ ЗДОЛЬНАСЦЬ — СУПЕРАЖЫВАННЕ

Кожны чалавек разумее псіхалогію па-свойму. А што яна значыць для спецыяліста, які звязаў сваё жыццё з гэтай прафесіяй? Пра гэта мы даведаліся ў **практыкуючага псіхолага Наталлі ЛАСКЕВІЧ**, якая 15 гадоў дапамагае людзям спраўляцца з цяжкімі сітуацыямі і знаходзіць шлях да сябе. Наталля Сцяпанаўна атрымала дзве адукацыі: першая — дэфекталагічная ў Мінскім дзяржаўным педагагічным інстытуце імя Максіма Танка, а другая па спецыяльнасці «Практычны псіхолаг» у Акадэміі паслядыпломнай адукацыі.

— Маладым псіхолагам, каб знізіць напружанне ад недахопу вопыту, рэкамендую пачынаць кансультаванне з людзьмі сваёй узроставай катэгорыі або малодшай. Менавіта таму пачаткам маёй прафесійнай дзейнасці стала работа псіхолагам у дзіцячым садзе. Далей я была педагогам-псіхолагам у інтэрнаце для дзяцей з парушэннем зроку, а пазней доўгі час кансультавала тых, хто сутыкнуўся з рознымі псіхалагічнымі цяжкасцямі, у тэрытарыяльным цэнтры сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, — расказала Наталля Сцяпанаўна.

Для работы псіхолагам аднойчы атрыманай адукацыі, няхай і вышэйшай, бывае недастаткова. Каб спецыялісты маглі дасягнуць высокага прафесійнага ўзроўню, цяпер існуе мноства семінараў, курсаў і трэнінгаў для павышэння кваліфікацыі. Трэба толькі не страчваць імкнення да самаадукацыі, што павінна быць цалкам натуральным для практыкуючага псіхолага, упэўнена суразмоўніца.

— У сваёй рабоце сінтэзую розныя методыкі і падыходы: «Арт-тэрапію», «Цялесна-арыентаваную псіхатэрапію», «Казкатэрапію» і «Сімвалдраму». Акрамя гэтага, у практыцы выкарыстоўваю аналітычныя, інтэгратыўныя трансперсанальныя і кліент-цэнтраваныя метады. Для лепшага разумення спецыфікі прафесіі магу параіць студэнтам псіхалагічнага факультэта ўжо ў пачатку навучання азнаёміцца з гэтай багатай разнастайнасцю методык.



Фота носіць ілюстрацыйны характар.

А на апошніх курсах выбраць для сябе тую, па якой будзе жаданне працаваць у будучыні, і асвойваць яе паралельна з акадэмічным навучаннем. Калі справа дойдзе да кансультавання, варта таксама выбраць адзін канкрэтны кірунак, напрыклад, сямейнае, дзіцячае альбо ж групавое, каб з-за спроб выпрабаваць сябе ва ўсім не адбылося выгарання, — патлумачыла псіхолаг.

На жаль, не існуе такой чароўнай палачкі, узмах якой здольны імгненна вырашыць усе праблемы без карпатлівай працы над сабой, у тым ліку для спецыяліста.

— Працэс псіхалагічнага кансультавання дазваляе раскрыць іншыя грані жыцця, убачыць сябе ў адлюстраванні іншага. Калі ў спецыяліста не адпрацаваны яго асабістыя праблемы і перажыванні, ён рызыкуе быць эмацыянальна ўключаным у гэты працэс або, куды яшчэ горш, уцягнуць кліента ў свае праблемы. Таму псіхолагам-пачаткоўцам трэба абавязкова праходзіць асабасную тэрапію, — падкрэслівае спецыяліст.

Сталенне часта адбываецца, калі маладыя людзі даследуюць розныя грані самых сябе і спрабуюць высветліць, хто яны як асобы. Нядзіўна, што многія юнакі і дзяўчаты робяць выбар на карысць псіхалогіі.

— Магу сказаць дакладна, што не варта ісці ў гэтую прафесію толькі дзеля добрай заробатнай платы, бо гэта можа абярнуцца на шкоду. Не таму, што работа псіхолага цяжкая — яна спецыфічная. Каб быць добрым спецыялістам, маладыя людзі павінны многае даведацца пра сябе, у першую чаргу — ці любяць яны людзей і ці гатовыя да блізкіх стасункаў з кліентамі, якія перажываюць гора і сур'ёзныя жыццёвыя цяжкасці. Важнай уласцівасцю душы псіхолага з'яўляецца і суперажыванне. Таму, калі вы вырашылі прысвяціць жыццё гэтай прафесіі, варта выпрацоўваць у сабе такую якасць, — раіць суразмоўніца.

**Надзея БОБРЫК, студэнтка IV курса факультэта міжкультурных камунікацый МДЛУ.**
**Фота дадзена суразмоўніцамі.**

*Лакацыі актыўнасці*

# Навігатар па экалагічных маршрутах

**У Беларускім дзяржаўным універсітэце распрацавалі мабільны дадатак «BY Guide» для экалагічных падарожжаў па Беларусі. Да гэтага часу такіх распрацовак у краіне не было, гэта своеасаблівая навігацыя па экалагічных маршрутах з улікам магчымасцяў і фізіялагічных асаблівасцяў наведвальнікаў. Падрабязнасці паведамляе Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.**

Кіраўніком і аўтарам ідэі стала аспірантка гістарычнага факультэта БДУ Святлана Далюк. Яна прапанавала зрабіць даступнай інфармацыю аб «зялёных маршрутах» праз анлайн-рэсурс. На дадзены момант даступная бэта-версія мабільнага дадатку «BY Guide» на Google Play.

У дадатку змяшчаюцца рэкамендацыі, каму падыдзе дадзены маршрут — людзям з парушэннем зроку або на калясцы, сем'ям з дзецьмі і жывёламі. Таксама кожная сцежка (маршрут) суправаджаецца апісаннем, фатаграфіямі і GPS-трэкам. Праверяныя напрамкі пазначаны кнопкай «знак якасці». У перспектыве плануецца распрацаваць аўдыягіды і ўключыць у дадатак сістэму для распазнання па спеве птушак і слядах жывёл.

Каманда «BY Guide» сабрала вялікую інфармацыйную базу аб лакацыях з усіх рэгіёнаў краіны (больш за 300 экалагічных сцежак і веламаршрутаў), якую ў поўным аб'ёме плануецца ўнесці ў дадатак да лета года.

Праект ужо высока ацанілі эксперты бізнес-інкубатараў Парка высокіх тэхналогій. З лістапада мінулага года «BY Guide» атрымаў рэзідэнцтва ў Стартап-цэнтры БДУ, стаў фіналістам конкурсаў Belarus Green Awards 2021 і АГРА 3.0, пераможцам першага ўсебеларускага маладзёжнага конкурсу стартапаў Startup Heart і Міжнароднай студэнцкай навукова-практычнай канферэнцыі «Фарміраванне экалагічнай культуры з дапамогай турызму».

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*Погляд праз час*

# РАШУЧАЕ «НЕ» НАЦЫЗМУ



Фота БелТА.

**Неабходна даць сігнал еўрапейскай супольнасці аб небяспецы праяўлення нацызму, заявіў першы сакратар ЦК БРСМ Аляксандр Лук'янаў падчас адкрытага дыялогу «Хатынь — святыня нацыянальнай памяці», прымеркаванага да Года гістарычнай памяці.**

Удзельнікі мерапрыемства ў Рэспубліканскім доме моладзі ў Мінску прапанавалі маладзёжнай арганізацыі шэраг новых патрыятычных праектаў. Сярод іх — «Хатынь у сямейных альбомах» — праект па ўшанаванні памяці ахвяр Хатыні, а таксама стварэнне памятнага знака на тэрыторыі мемарыяльнага комплексу як цэнтра еўрапейскага генацыду.

Аляксандр Лук'янаў агучыў ініцыятыву грамадскіх аб'яднанняў да міжнароднай грамадскасці. «Разам з нашымі найбуйнейшымі грамадскімі аб'яднаннямі мы прыйшлі да разумення, што неабходна чарговы раз даць сігнал еўрапейскай супольнасці, ды і ўсёй міжнароднай грамадскасці аб небяспецы праявы нацызму, — звярнуўся ён да ўдзельнікаў дыялогу. — Нельга дапусціць яго адраджэння ў сучасным свеце ў любых формах праявы».

Адкрыты дыялог даў своеасаблівы старт рэалізацыі ініцыятывы БРСМ аб стварэнні на тэрыторыі мемарыяльнага комплексу паўнацэннага музея і аб'яўленні яго будаўніцтва Усебеларускай маладзёжнай будоўляй. Такая ініцыятыва была прапанавана першым сакратаром ЦК БРСМ Аляксандрам Лук'янавым і адобрана кіраўніком дзяржавы падчас Паслання беларускаму народу і парламенту.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

*Юрыдычны фармат*

# «Правы на кожны дзень»

**Праект пад такой назвай запусцілі студэнты БДУ. Ён накіраваны на павышэнне ўзроўню прававой адукаванасці сярод моладзі, фарміраванне грамадзянскай адказнасці, талерантнасці, здольнасці да паспяховай сацыялізацыі ў грамадстве і павагі да правоў іншага чалавека, а таксама прафарыентацыйную падтрымку старшакласнікаў.**

Ініцыятарамі праекта выступілі студэнты юрыдычнага факультэта БДУ. Курыруе яго рэалізацыю намеснік начальніка Цэнтра адукацыйных інавацый, начальнік аддзела «Юрыдычная клініка» Таццяна Навумовіч.

Ідэя заключаецца ў навучанні школьнікаў прававым асновам праз сучасныя гульні. Адной з іх з'яўляецца каманды двухгадзінны квэст. Удзельнікам трэба выканаць заданні юрыдычнай тэматыкі, максімальна адаптаваныя да рэальных працэсаў. Напрыклад, хлопцам і дзяўчатам могуць прапанаваць скласці з літар назву заканадаўчага дакумента, справядліва падзяліць маёмасць пры разводзе, зрабіць агляд месца злачынства і іншае.

Таксама праект уключае правядзенне тэста-гульні «МазгаLAWля» з 30 тэматычных пытанняў. Трэба назваць галіну права, якой не існуе ў заканадаўстве Беларусі, або ўзрост, з якога можна весці самастойную працоўную дзейнасць. Пытанні распрацоўваюцца з улікам узросту навучэнцаў. Для ліцэяў і школ з паглыбленым вывучэннем грамадазнаўства — больш складаныя заданні.

Акрамя таго, у рамках праекта для школьнікаў студэнты-юрысты БДУ праводзяць лекцыі і семінары. Гэта дазволіць пазнаёміць хлопцаў і дзяўчат з заканадаўчымі асновамі дзяржавы і нормамі, расказаць аб правах, абавязках і адказнасці кожнага грамадзяніна.

Усе заданні для гульняў і тэматыку сустрэч складаюць студэнты-юрысты БДУ.

Стаць удзельнікамі праекта могуць вучні сталічных школ. Для гэтага неабходна настаўніку па грамадазнаўстве або прадстаўніку школы, ліцэя, гімназіі патэлефанаваць па тэл. 8 (017) 209-55-23 і абмеркаваць фармат заняткаў («Юрыдычная клініка» БДУ).

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
24 03 2022 г.

SEX-БАЛЯСЫ

# Рэкламны трук

**Пачну з анекдота. «Сустракаюцца неяк два бізнесмены і адзін у размове мімаходзь кажа, што купіў сабе слана. Другі здзіўляецца: «Як гэта? Гэта ж столькі праблем!» — «Наадварот, адны прыемныя навіны! Дзеці сталі больш паслухмяныя, лепш вучацца. Жонка лагодная. З цешчай узаемаадносіны палепшыліся!» — «Бач ты! Слухай, а прадай слана мне?!» — «Не, такая жывёліна патрэбная самому! Зрэшты, як найлепшаму партнёру... За колькі купіў, за столькі і прадам — забірай!» Прайшоў час, зноў абодва сустрэліся. Пакупнік: «Слухай, чаго ты мне нагаварыў?! У мяне слон усё разнёс, усё загадзіў! Дзеці напалоханыя, жонка пагражае на развод падаць, цешча ўвогуле ад нас з'ехала!..» — «Чакай-чакай, братан! З такім настроем ты слана дакладна не прадасі!» Такім чынам, тэма сённяшніх нататок — рэклама і настрой.**

Незвычайны спосаб абраў краснадарац Вадзім Этман для продажу сваёй кватэры. Як расказаў гаспадар жылля, да афармлення здзелкі ён вырашыў падысці творча і крэатыўна. («Калі вы запрасілі дзяўчыну карміць рыбак, а акварыума ў вас ніколі не было, адкрыйце хоць бы бляшанку шпротаў. Як правіла, пакрышыўшы туды крыху хлеба, дзяўчаты пачынаюць здагадвацца, навошта іх пазвалі».) Ён не проста адправіў аб'яву на сайт «Авіта» з фатаграфіямі, а напісаў песню і зняў кліп пра сваё любімае жыллё, з якім даводзіцца расставацца. «Мая двушка — гэта пушка», — без ілжывай сціпласці заявіў Вадзім. Былі там і аголены торс, і здымкі ў ваннай і ложку... («Дарагая, давай на ложку?» — «Так!» — «А цяпер на кухні?» — «Так!» — «А цяпер у калідоры!» — «Вы кватэру здымаць будзеце?») Да здымкаў малады чалавек падышоў адказна. Прыйшлося папацець у прамым сэнсе гэтага слова: хлопец схуднеў і напампаваў мышцы. Атрымалася сапраўды арыгінальна, праўда, невядома, ці ўсе дзяўчаты-пакупніцы змаглі разгледзець плюсы кватэры, а не любаваліся толькі яе гаспадаром. («Тэлеканал мод — якраз той канал, які мужчыны і жанчыны могуць з задавальненнем глядзець разам. Але яны не змогуць потым абмеркаваць тое, што адбывалася, таму што бачылі розныя рэчы».) Мэта гэтай творчасці, як кажа Этман, 50 працэнтаў хайпу і 50 працэнтаў — «паскарэнне» продажу. Вадзіму паступіла мноства прапаноў зняць падобны ролік для іншых кватэр або машын. («Я здымаю кватэру з аднакурснікам. Часам заводжу фальшывыя акаўнты ў Tinder, «знаёмлюся» з ім там і пасля непрацяглага фліpту абяцаю прыехаць у госці. Прыемна глядзець, як ён пасля гэтага драіць жыллё».) Прафесійных жа агентаў па продажы нерухомасці такі нестандартны падыход павесяліў. Але, на іх думку, наўрад ці гэта дапаможа ўладальнікам хутка знайсці патэнцыйных пакупнікоў. («Дзве студэнткі здымалі кватэру і вырашылі паставіць маскітныя сеткі на вокны, каб ніхто не заляцеў. Але, на жаль, ім абедзвюм гэта не дапамагло».) Меркаванне краснадарцаў таксама падзялілася. Адны лічаць, што толькі так і трэба прадаваць кватэры, іншыя, наадварот, шакіраваны. «Дапамажыце мне зразумець: малады чалавек сябе прадае ці кватэру?» («Калі ў жанчыны адначасова глыбокае дэкальтэ і міні-спадніца, гэта прыводзіць да касавокасці ў мужчын».)



А жыхар Чэлябінска Аляксандр Кайноў паспрабаваў выкарыстаць калажы з фатаграфіямі галівудскага рэжысёра Квенціна Таранціна, каб прадаць сваю трохпакаёвую кватэру. («Адзенне павінна падкрэсліваць вартасці фігуры і хаваць недахопы зарплаты».) Ён прыфаташопіў вывы знакамітасці, выразаныя са здымкаў, якія зрабілі падчас візіту рэжысёра ў Расію, да фота тыпавога расійскага жылля. На калажах Квенцін стаіць у ваннай з аблупленай кафляй, паказвае вялікі палец у пакоі і разглядае просценькую кухню. («Адзінокі мужчына засяліўся ў кватэру. Вечарам трэцяга дня раздаецца званок у дзверы. Адчыняе, а там жанчына: «Прывітанне, я ваша суседка. У вас выпадкова соль не скончылася?») «Людзям падабаецца, я задаволены вынікам, сама задума вельмі цікавая». («Мужчын трэба здзіўляць. Вось прыходзіць ён з работы, а ты кватэру ў карты прайграла. Нечакана? Нечакана!») У каментарыях у «Фэйсбуку» карыстальнікі пыталіся, ці прыкладаецца «мужык» да кватэры? А таксама называлі серыю калажаў «Агідная траячкай» (адсылка да назвы аднаго з фільмаў Таранціна «Агідная васьмёрка»).

Кампанія Yota размясціла рэкламу на фасадзе дома ў Маскве. Але яна, здаецца, не спадабалася нейкаму Сяможу — гэтае імя велізарнымі літарамі напісалі над графіці. («Уяўляеце, прыходжу дадому, а ён з палюбоўніцай. Ну, я пайшла на кухню, адкрыла халадзільнік, дастала бутэльку гарэлкі, выпіла залпам, паспявала сумных песень... А потым гляджу: кватэра ж не мая!») У кампаніі зрабілі новую рэкламу, але на гэты раз... са згадваннем Сярожы. Яшчэ і аўтарскі стыль захавалі. («— Ну што, купіў кватэру?» — «Не, здымаю». — «Ажаніўся?» — «Не, здымаю».) Раней на тым месцы доўгі час было графіці «Аэрафлота» са сцюардэсай, якая «ўсім падабалася». («Аб'ява: «Патрабуецца дзяўчына на запчасткі». Не адразу здагадаўся, што гаворка аб прадаўцы ў краму запчастак».) Не ўсе адобрылі новы стрыт-арт на доме. Графіці перамалявалі, і замест стандартнага слогана «Графіці з рэкламай Yota» на фасадзе дома з'явіўся надпіс «Графіці з рэкламай Yota і Сярожа». («Прадаецца двухспальны ложак з адным свабодным месцам».) Такая рэклама, такі настрой...

**Кастусь ХАЦЕЛАЎ-ЗМАГЕЛАЎ.**

# «Алімпійскія гульні надалі мне матывацыі»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «ЧЗ».)*

***— Магчыма, любові да спартыўнай гімнастыкі дадало і тое, што ты займаешся ў школе легендарнага трэнера Рэнальда Кныша?***

— Безумоўна. На мой погляд, вучыцца трэба ў найлепшых. Мне ў гэтым вельмі пашанцавала. Рэнальд Іванавіч стварыў унікальную методыку, гэта сапраўды легендарны трэнер. А мой асабісты трэнер — Вольга Мікалаеўна, яго жонка. І ўсяго дасягнула менавіта з ёй. Дарэчы, мне пашчасціла пазнаёміцца з Рэнальдам Іванавічам. Ён прыходзіў да нас на трэніроўкі, калі я была маленькая. Нават нешта падказваў, даваў парады. Вельмі важна для спартсмена атрымаць словы падтрымкі ад такога майстра і працаваць па яго методыцы.

**«Калі на першых спаборніцтвах заняла трэцяе месца, адчула, што ў будучыні хачу быць першай».**

Сёння з трэнерам я праводжу больш часу, чым з бацькамі. Вольга Мікалаеўна мне дапамагае не толькі ў спорце, але і ў пэўных жыццёвых сітуацыях. На Алімпійскіх гульнях яна была маёй галоўнай падтрымкай, перажывала як ніхто іншы, рабіла ўсё, каб я не хвалявалася. Вельмі важна, што яна на мяне не ціснe, не патрабуе вынікаў. Напрыклад, на Алімпіядзе яна разумела, што гэта вялікая адказнасць, да якой мы, магчыма, былі не гатовыя. І яна проста настройвала мяне на добрае выступленне, а не чакала нечага звышнатуральнага.

***— Дарэчы, пра Алімпійскія гульні. Памятаеш свае эмоцыі, калі даведалася, што ты будзеш на іх выступаць?***

— Хіба такое забудзеш! Я тады ўзрадавалася і здзівілася адначасова. Радасці, мабыць, было больш. Ніхто не планаваў, што ў Токіа паеду я, і часу на падрыхтоўку да галоўных стартаў было вельмі мала. Таму два тыдні перад Гульнямі былі вельмі насычаныя. Мне здаецца, і сёння не веру, што выступала на Алімпійскіх гульнях. Было вельмі цікава на свае вочы ўбачыць галоўныя старты і выступленні вядучых спартсменаў свету. Пасля Алімпіяды мне захацелася трэніравацца яшчэ больш, рабіць свае праграмы лепшымі. Алімпійскія гульні надалі мне матывацыі. Шкада, што Токіа не ўдалося паглядзець. Гэта вельмі цікавы горад з выдатнай архітэктурай. І хацелася б пазнаёміцца з ім бліжэй, але мы прыехалі ў першую чаргу спаборнічаць, таму выконвалі ўсе каранавірусныя абмежаванні.



***— Выступленні сваіх куміраў у Токіа ўбачыла?***

— Не магу сказаць, што ў мяне ёсць куміры. Падабаецца гімнастыка, якую паказваюць расіянкі. Я бачыла жаночы фінал каманднага турніру, дзе яны сталі алімпійскімі чэмпіёнкамі. Гэта быў вельмі яркі момант. У свеце шмат спартыўных гімнастаў, чые выступленні мяне захапляюць. І я бясконца паважаю гэтых людзей, бо ведаю, якую вялікую працу яны выконваюць штодня. У некаторых заўважаю цікавыя элементы і спрабую ўключыць іх у свае праграмы. У некаторых заўважаю памылкі, і гэта таксама карысна.

**«Вельмі важна для спартсмена атрымаць словы падтрымкі ад такога майстра і працаваць па яго методыцы».**

***— На Алімпіядзе ў Токіа шмат шуму нарабіла гісторыя з Сімонай Байлз, якая знялася са шматбор'я і расплачылася свой крок праблемамі з псіхічным здароўем. Пасля гэтага шмат разважалі аб ментальным здароўі спартсменаў. На твой погляд, наколькі важна быць гатовым не толькі фізічна, але і псіхалагічна?***

— Сімона Байлз — выдатная гімнастка. Не ўяўляю, што такое магло здарыцца, каб яна адмовілася выступаць на галоўным старце. Канешне, псіхалагічны стан кожнага спартсмена павінен быць у норме. Лішнія хваляванні могуць сапсаваць вынік. І кожны спартсмен перажывае перад выступленнем, важна ўмець з гэтым спраўляцца. Я выходжу на старт з намерам зрабіць усё, як на трэніроўцы. Прыкладна ўяўляю, якую адзнаку хачу атрымаць, але не зацыкліваюся на гэтым. Мая задача — максімальна добра выканаць свае праграмы. І маё галоўнае правіла — не расслабляцца, у спартыўнай гімнастыцы гэта недапушчальна. Нашы выступленні — своеасаблівы экзамен, які нельга і не хочацца правальць.

***— Адзін з герояў гэтай Алімпіяды Артур Далалаян выступаў з незалечанай траўмай. У тваёй кар'еры былі выпадкі, калі даводзілася выступаць нягледзячы на такое?***

— На ўсіх апошніх стартах сезона мы выступаем з траўмамі. Некалькі разоў даводзілася выходзіць з невялікімі. Перад спаборніцтвамі не думаю ні аб чым, акрамя выступлення. Ні на што не звяртаю ўвагі. Але пасля спаборніцтваў абавязкова займаюся сваім здароўем.

***— Ганна, раскажы калі ласка, як табе ўдаецца трымаць сябе ў добрай форме?***

— Існуе меркаванне, што ўсе гімнасты сядзяць на вельмі строгай дыеце. Але гэта не так. Не трэба ніякіх дыет. Галоўнае — прыслухоўвацца да свайго арганізма. Нават знакамітае правіла «не есці пасля шасці гадзін вечара» для мяне не працуе. Мая другая трэніроўка пачынаецца ў 16.00, а заканчваецца ў 19.00. Я ж не магу з сярэдзіны дня нічога не есці. Канешне, я не ем фаст-фуд, гэта ў прынцыпе шкодна для кожнага, а не толькі для спартсменаў. Калі мне хочацца, напрыклад, пірожнае, я сабе гэта дазваляю. Потым на трэніроўцы ўсё адпрацую. Спартыўная гімнастыка даўно стала маёй любімай справай, і дзеля яе я гатовая адмовіцца ад шмат чаго, але не наадварот.

***— Ганна, раскрый, калі ласка, сакрэт сваёй спартыўнай матывацыі?***

— У мяне, як і ва ўсіх спартсменаў, адна мэта — добра выступаць на кожным старце, асабліва на галоўных. Мяне матывуюць вынікі. Чым яны вышэйшыя — тым больш сіл працаваць яшчэ больш і станавіцца лепшай.

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота з архіва гераіні.**

ЧЫРВОНКА Чырвоная змена
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 12
ад 19 лютага 2009 года выдадзена
Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі газеты —
рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»,
грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі».
Дырэктар — галоўны рэдактар
КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказныя за выпуск: рэдактар аддзела
Надзея НІКАЛАЕВА, рэдактар аддзела Сяргей РАСОЛЬКА.
Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"».
Адрас рэдакцыі: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.
Кантактныя тэлефоны: 292 44 12, 311 17 41.
e-mail: info@zviazda.by
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве
«Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
ЛД №02330/0494179 ад 03.04.2009.
220013, г. Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1.
Тыраж 14.804.
Нумар падпісаны ў 19.30 23.03.2022 г.

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| Продавец | **Унитарное предприятие «Калинковичский молочный комбинат», Гомельская область, г. Калинковичи, ул. Суркова, 10** |
| Оператор ЭТП | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703** |
| Адрес ЭТП | **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**
**Месторасположение:** Гомельская обл., Петриковский р-н, г. Петриков, ул. Коммунальная, 87 и Петриковский р-н, севернее города Петрикова

**Производственная база** в составе: **мойка транспорта** (335/С-102896, общ. пл. 92,5 кв. м), **здание котельной, одноэтажное, кирпичное** (335/С-6633, общ. пл. 380,2 кв. м, составные части: две пристройки), **здание цеха, одноэтажное, кирпичное** (335/С-102896, общ. пл. 2 125,7 кв. м, составные части: шесть пристроек), **здание склада – ангара, одноэтажное, кирпично-металлическое с тремя нежилыми изолированными помещениями** (335/С-6628, общ. пл. 523,9 кв. м), **здание компрессорной, одноэтажное, кирпичное** (335/С-6634, общ. пл. 301,2 кв. м, составные части: пристройка), **здание конторы, одноэтажное, кирпичное, окрашенное** (335/С-6631, общ. пл. 347,2 кв. м, составные части: терраса), **проходная** (335/С-102936, общ. пл. 9,5 кв. м), **здание КНС, одноэтажное, кирпичное** (335/С-6630, общ. пл. 12,2 кв. м), **трансформаторная подстанция** (335/С-102897, общ. пл. 42,6 кв. м, составные части: трансформаторная подстанция), **асфальтированная дорога к навесу с дезбарьером** (335/С-102916, общ. пл. 187,0 кв. м, составные части: асфальтированная дорога к навесу с дезбарьером), **отстойник** (335/С-102919, общ. пл. 27 955,9 кв. м, составные части: отстойник), **отстойник 2-х ярусный** (335/С-102920, общ. пл. 40,0 кв. м, составные части: отстойник 2-х ярусный), **навес с дезбарьером** (335/С-102900, составные части: Навес с дезбарьером), **забор кирпичный** (335/С-102898, составные части: Забор кирпичный), **забор железобетонный** (335/С-102917, составные части: Забор железобетонный), **забор железобетонный** (335/С-102918, общ. пл. 1075,0 кв. м, составные части: забор железобетонный), **автодороги внутризаводские** (335/С-102899, общ. пл. 5 449,5 кв. м, составные части: автодороги заводский), **трубопровод из труб из полимерных материалов** (335/С-789604, общ. пл. 220,3 кв. м, составные части: А-Трубопровод из труб из полимерных материалов), **тепловые сети** (335/С-789602, общ. пл. 18,9, составные части: П-Тепловые сети), **кабель подземный** (335/С-78960, составные части: Т- Кабель подземный), **напорная канализация** (335/С-70936, составные части: трубопровод напорный, протяженность 108 м. трубопровод напорный протяженность 282 м, трубопровод напорный протяженность 80 м), **сеть канализационная** (335/С-789603, общ. пл. 247,0 кв. м, составные части: С-Сеть канализационная), **сеть водопроводная** (335/С-789605, общ. пл. 21,0 кв. м, составные части: Р-Сеть водопроводная), **гараж** (335/С-789639, общ. пл. 208,0 кв. м), **склад ГСМ** (335/С-789635, общ. пл. 31,1 кв. м), **склад металлический** (335/С-789637, об. пл. 17,2 кв. м), **склад металлический** (335/С-789636, общ. пл. 17,2 кв. м), **здание мазутонасосной, одноэтажное, кирпично-металическое** (335/С-6632, общ. пл. 48,8 кв. м), **скважина артезианская** (335/С-789634, общ. пл. 20,3 кв. м), **скважина артезианская** (335/С-789638, общ. пл. 19,7 кв. м), **труба дымовая кирпичная** (335/С-789632, общ. пл. 11,0 кв. м), **труба дымовая металлическая** (335/С-789633, общ. пл. 1,0 кв. м), **резервуар пожарный** (335/С-789628), **башня водонапорная** (335/С-789629, общ. пл. 13,0 кв. м), **емкость для хранения топлива** (335/С-789630, общ. пл. 28,0 кв. м), **емкость для хранения топлива** (335/С-789631, общ. пл. 28,0 кв. м). **Иное имущество, входящее в состав лота:** механизм открывания ворот (инв. № 1740), механизм открывания ворот (инв. № 1741), устройство щелочных растворов (инв. № 2071), экономайзер (инв. № 2081), котел паровой Е-1,0-9М-2 (инв. № 2154), котел паровой Е-1,0-9М-2 (инв. № 2153), фильтр натрикатионовый (инв. № 2072), фильтр натрикатионовый (инв. № 2073), щит автоматики (инв. № 2077), щит 1946/2 (инв. № 2079), пресс гидравлический 1671-М (инв. № 1761), компрессор BITZER 4CC-6.2Y-40S (инв. № 3231), компрессор воздушный 0,4 Мпа (г. Ереван) (инв. № 1967), компрессор воздушный С 416М 01 (Бежецкий завод) (инв. № 1969), агрегат насосный К8/18 с эл. двигат 2,2/3000 (инв. № 5006), агрегат К-20/18 с дв. 2,2/3000 (насос) (инв. № 5169), насос центробежный Г2-ОПБ (36-1Ц 10-20) (инв. № 3496), насос НГ-1,6/1,6 (инв. № 5170), агрегат насосный 1 К-20/30 (инв. № 5090), насос 1К 20/18 (инв. № 5092), агрегат эцв 8-16-140 (инв. № 5056), насос АН-116 (инв. № 5066), электронасос центробежный Г2-ОПБ (инв. № 3188), Насос ОНЦ-10 (инв. № 5076), Насос шестяренчатый (Мастер) ТШ 50-М-3Л (инв. № 5077), насос шестеренчатый (инв. № 2049), насос шестеренчатый (инв. № 2048), насос НС-50/56 22 КВТ (инв. № 2025), вентилятор ВЦ 4-75-5 (1,5/1500) (инв. № 3274), вентилятор ВЦ 4-75-5 (1,5/1500) (инв. № 3276), вентилятор ВЦ-4-75-5 (1,5/1500) (инв. № 3277), воздухоохладитель S3HC 290 E 65 (инв. № 2736), воздухоохладитель S3HC 117 E 65 (инв. № 2738), вентилятор ВЦ 4-75-5 (1,5/1500) (инв. № 3278), электроталь (инв. № 2091), резервуар Я-1 ОСВ-6,3 (инв. № 341), станок настольно-сверлильный (инв. № 1765), станок заточный (инв. № 1766), станок токарно-винторезный (инв. № 1769), станок круглопильный (инв. № 2063), резервуар молочный Я1-ОСВ-5 (инв. № 1830), резервуар молочный Я1-ОСВ-5 (инв. № 1831), резервуар молочный Я1-ОСВ-5 (инв. № 1833), очиститель высокого давления (инв. № 2658), ванна молочная (инв. № 1786), резервуар молочный Я1-ОСВ-5 (инв. № 1834), резервуар молочный Я1-ОСВ-5 (инв. № 1836), резервуар В2-ОМГ-10 (инв. № 1837), резервуар В2-ОМГ-10 (инв. № 1838), резервуар В2-ОМГ-10 (инв. № 1839), резервуар молочный Я1-ОСВ-1,0, (инв. № 1846), охладитель ООЛ-25 (инв. № 1802), резервуар металлический вертикальный 50 куб. м (инв. № 1845), резервуар металлический вертикальный 50 куб. м (инв. № 1844), резервуар металлический вертикальный 50 куб. м (инв. № 1843), резервуар металлический вертикальный 50 куб. м (инв. № 1842), ванна молочная (инв. № 1787), резервуар В2-ОМГ-10 (инв. № 1841), резервуар В2-ОМГ-10 (инв. № 1840), бункер 15 куб. м (сталь нерж.) (инв. № 1780), бункер 15 куб. м (сталь нерж.) (инв. № 1781), аппарат для упаковки термопленки ТПУ-370 (инв. № 505), резервуар молочный Я-1 ОСВ-3 (инв. № 1819), резервуар молочный Я-1 ОСВ-6,3 (инв. № 1820), резервуар молочный Я-1 ОСВ-6,3 (инв. № 1821), резервуар молочный Я-1 ОСВ-6,3 (инв. № 1824), резервуар молочный Я-1 ОСВ-3 (инв. № 1818), резервуар молочный Я-1 ОСВ-6,3 (инв. № 1825), бункер 15 куб. м (сталь нерж.) (инв. № 1782, пастеризатор ОКЛ-10 (инв. № 1805), охладитель ООЛ-25 (инв. № 1803), ванна сырная (инв. № 1785), холодильная фреоновая установка (инв. № 3190), морозильник «Минск» (инв. № 1795), холодильник бытовой Саратов (инв. № 2666), холодильная витрина ТИТАНУМ (инв. № 2494), стеллаж охладающий ОКТАВА (инв. № 2532), холодильный агрегат 4СС-9,2 Y (инв. № 2735), холодильный агрегат 2DC-3,2 Y (инв. № 2737), гардероб (инв. № 2534), термостат-инкубатор «BETA STAR-25» (инв. № 2937), рефрактометр ИРФ-464 БЕЛКОМЕТР (инв. № 736), стерилизатор (инв. № 2664), центрифуга лабораторная (инв. № 1917), микроскоп (инв. № 1901), шкаф вытяжной (инв. № 2665), инкубатор для тестирования пробы молока БЕТА СТАР КОМБО (инв. № 2974), мельница ЦИКЛОН МЛ-1 (инв. № 3152), прибор для определения чистоты казеина (инв. № 3155), стерилизатор (инв. № 1854), расходометр РСМ-05,03 (инв. № 712), расходометр-счетчик РСМ 05 ДУ-25 ТИП ТСПА (инв. № 2749), расходометр-счетчик РСМ 05 ДУ-25 ТИП ТСПА (инв. № 2750), расходометр-счетчик «ДНЕПР-7» (инв. № 3160), гамма-радиометр РКГ-05-П (инв. № 670), прибор радиометрический РКГ-01А (инв. № 1585), прибор РН-МЕТР (инв. № 1911), прибор Y-излучения (инв. № 1905), прибор «ЛАКТАН» (инв. № 2129), весы электронные настольные МК-6,2-А21 (инв. № 5129), весы электронные (инв. № 1951), весы СМП-84М (инв. № 1893), весы электронные АД-5 (инв. № 3077), весы ВЛК (инв. № 1894), вессовой индикатор С 1-6000 А (инв. № 3385), холодильная витрина ТИТАНУМ (инв. № 2495), трансформатор силовой 400/10 (инв. № 2065), насос центробежный д/сточных масс СМ-100-65-200 (инв. № 3010), насос центробежный д/сточных масс СМ-100-65-200 (инв. № 3011), кондиционер MSE-12 HRN-1 (инв. № 3423), аппарат сварочный ВДУ-106 (инв. № 1947), трансформатор сварочный ТДМ 252 42/220 (инв. № 3186), аппарат высокого давления без подогрева воды HD 13/12-4 ST-H (инв. № 3713), сепаратор для очистки молока (инв. № 5047), система видеонаблюдения общезаводская (Петриков) (инв. № 5213), сотовый телефон NOKIA C 1-01-IMEI (инв. № 3562), сотовый телефон NOKIA 2700C-2 (инв. № 3111), холодильник МХ-365-00 (инв. № 2768), холодильник-морозильник ХМ 4012-020 (инв. № 3057), Автоматизированная система коммерческого учета (инв. № 3424), счетчик холодной воды турбинный фланцевый (инв. № 4070), счетчик-расходомер ультразвуковой РСВУ-1400 (инв. № 3712), узел коммерческого учета теплоэнергии (инв. № 2172), шкаф ламинированный ВА-1.2 (инв. № 3664), монитор LG 19 EN 33 S-B-Black (инв. № 3637), монитор 21,5 LG (инв. № 5163), мультифункциональное устройство CANON I-SENSYS MF (инв. № 2947), принтер лазерный HP 2035 (инв. № 5093), ПЭВМ HAFF Maxima DF 40-IX 22 D 05 (инв. № 3638), ПЭВМ SKY SYSTEMS Intel CELERON (инв. № 5161), кусторез «Штиль» FS 400 (инв. № 2662), тример MG 158 (инв. № 5159), тележка гидравлическая (инв. № 1933), телевизор «Витязь» (инв. № 3161), объекты растительного мира (инв. № 3164), полуприцеп ОДАЗ 9772 (инв. № 2158), автопогрузчик (инв. № 1945)

***Сведения о земельном участке 1:*** предоставлен продавцу для содержания и обслуживания зданий и сооружений завода на праве постоянного пользования пл. **2,6614 га.** ***Сведения о земельном участке 2:*** предоставлен продавцу для содержания и обслуживания очистных сооружений (для размещения объектов коммунального хозяйства) на праве постоянного пользования пл. **4,3024 га**

**Начальная цена лота с НДС 20 % – 2 457 015,36 бел. руб.**
**Шаг аукциона: 5 % от текущей цены**

С подробной информацией по предмету электронных торгов можно ознакомиться на сайте организатора электронных торгов **www.cpo.by**

**Задаток 5 %** от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с (BYN) BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи: 15 (пятнадцать)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов: 100 процентов** от цены продажи предмета торгов оплачиваются в течение **5 (пяти) рабочих дней** с даты заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. **Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности**, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признаётся участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение **1 (один) процент** от цены продажи лота в течение **3 (трех) рабочих** дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

| | |
|---|---|
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | **Начало торгов в 11.00 25.04.2022 г.** **Окончание торгов в 13.00 25.04.2022 г.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 22.04.2022 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by** |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by** |

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| Организатор аукциона, оператор ЭТП | **ООО «Расантехторг», г. Минск, ул. Беды, 33, помещение 339. Адрес ЭТП: www.torgi24.by** |
| Продавец | **ОАО «Столбцовский РКБО» Минская область, г. Столбцы, ул. Я Коласа, 28** |

**Предмет электронных торгов:**

| Лот | Наименование (назначение), инвентарный номер | Начальная цена с НДС (бел. руб.) |
|---|---|---|
| 801 | Капитальное строение, 622/С-46405 | 6 984,00 |
| 802 | Капитальное строение, 622/С-46404 | 6 072,00 |
| 803 | Капитальное строение, 662/С-46902 | 3 840,00 |
| 804 | Капитальное строение, 662/С-46903 | 3 168,00 |

**расположенные по адресу:**
Минская обл., Столбцовский р-н

**Размер шага** составляет **5 %** от начальной цены лота

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях (**для каждого лота**) перечисляется на р/с BY56UNBS30120893600010000933 в ЗАО «БСБ Банк», код UNBSBY2X, г. Минск, пр-т Победителей, 23/3, УНП 191514793, получатель: ООО «Расантехторг»

**Срок подписания договора купли-продажи: 5** (пять) рабочих дней после электронных торгов

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Победитель торгов (претендент на покупку), обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан возместить затраты на проведение торгов и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **10 %** от цены продажи лота в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Затраты на организацию и проведение электронных торгов составили: по лоту (для каждого лота) – **не более 1 750,00 бел. руб.**

**Дата и время начала торгов: 08.04.2022** в 09.00.
**Дата и время окончания торгов: 08.04.2022** в 16.00

Для участия в торгах, необходимо подать заявку и пройти регистрацию в качестве участника торгов на торговой площадке: **www.torgi24.by**. Прием документов на участие в торгах осуществляется организатором торгов ООО «Расантехторг» на электронную почту: **info@torgi24.by**. Срок приема заявлений на участие в торгах и оплаты задатка – с **24.03.2022 по 06.04.2022** с 9.00 до 17.00

**Контактные данные:**
**+375 (29) 607-79-50; +375 (29) 607-22-87.**
**E-mail: info@torgi24.by.**

## ЗАО «БелБанкротАукцион»,

организатор торгов по продаже имущества ЗАО «ДОРОЖНАЯ СПЕЦИАЛИЗИРОВАННАЯ ПЕРЕДВИЖНАЯ МЕХАНИЗИРОВАННАЯ КОЛОННА № 94» (УНП 600045674), ОБЪЯВЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 13.04.2022 **г.** в 10.00 ПУБЛИЧНЫХ ТОРГОВ по адресу: г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, комн. 501.

Предмет торгов

| № лота | Наименование | Начальная стоимость, бел. руб., без НДС | Сумма шага, 5 % бел. руб., без НДС | Сумма задатка, 10 % бел. руб., без НДС |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Изолированное помещение с инвентарным номером 614/D-20246, общей площадью 39,7 кв. м, расположенное по адресу: Минская область, Смолевичский р-н, Плисский с/с, д. Полевая, д. 1-2. Наименование – квартира, назначение – квартира. Число комнат – 2 | 15 030,00 | 751,50 | 1503,00 |

Ознакомиться с предметом торгов можно в рабочее время, предварительно связавшись с контактным лицом по тел. +375296083100.

Продавец: ЗАО»ДОРОЖНАЯ СПЕЦИАЛИЗИРОВАННАЯ ПЕРЕДВИЖНАЯ МЕХАНИЗИРОВАННАЯ КОЛОННА № 94».

**Организатор торгов:** ЗАО «БелБанкротАукцион», 220015, г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, комн. 501; +375296083100; contact@bankrottorg.by.

Для участия в торгах необходимо уплатить задаток в размере 10% от начальной стоимости лота не позднее **12.04.2022 г.** на р/с BY16 UNBS 3012 0116 4010 0000 8933, в ЗАО «БСБ Банк», БИК UNBSBY2X, УНП 193417684, получатель – ЗАО «БелБанкрот-Аукцион». Назначение платежа: задаток за участие в торгах по лоту № (номер лота).

Заявления на участие в торгах принимаются с 9.00 **30.03.2022** по 17.00 **12.04.2022** по адресу: г. Минск, ул. Гурского, д. 22б, комн. 501.

К заявке на участие в торгах прилагаются (для юридических лиц) следующие документы:
- свидетельство о государственной регистрации юр. лица (ИП);
- устав юридического лица;
- решение высшего органа управления юридического лица об участии в торгах, о заключении договора купли-продажи предмета электронных торгов, по итогам их проведения;
- для физических лиц: 31, 32, 33 стр. паспорта.

Организатор торгов может отказаться от проведения торгов не позднее чем за пять дней до даты проведения торгов.

Победителем торгов признается лицо, предложившее наивысшую цену за предмет торгов.

Оформление результатов торгов в день проведения торгов.

В случае признания торгов несостоявшимися предмет торгов может быть продан единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (претендент на покупку), при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Затраты на организацию и проведение торгов составили: за размещение объявления о проведении торгов в базе данных ЕГРСБ 240,00 бел. руб; стоимость размещения объявления в газете «Звязда» согласно счету-фактуре; за оценку – 250,00 бел. руб., аукционный сбор 5 % от цены реализации имущества.

Срок подписания договора купли-продажи: в течение 15 (пятнадцати) календарных рабочих дней со дня проведения аукциона.

Срок оплаты по договору купли-продажи: в течение 15 (пятнадцати) календарных дней с даты проведения торгов.

## ИНФОРМАЦИЯ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**28 апреля 2022 г.** по продаже гражданам Республики Беларусь в частную собственность земельных участков для коллективного садоводства на территории Смолевичского района

**Организатор аукциона: Смолевичский районный исполнительный комитет, 222201, г. Смолевичи, ул. Советская, д. 125**

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер | Площадь (га) | Целевое назначение | Начальная цена земельного участка (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Минская область, Смолевичский р-н, Жодинский с/с, СТ «Журавинка», Жодинской ТЭЦ, участок № 93 | 624881700011000306 | 0,06 | для коллективного садоводства (1 03 02 земельный участок для коллективного садоводства) | 2000 |
| 2 | Минская область, Смолевичский р-н, Жодинский с/с, СТ «Журавинка», Жодинской ТЭЦ, участок № 94 | 624881700011000307 | 0,06 | для коллективного садоводства (1 03 02 земельный участок для коллективного садоводства) | 2000 |
| 3 | Минская область, Смолевичский р-н, Жодинский с/с, СТ «Садовод», д. 116 | 624881700007000261 | 0,0570 | для коллективного садоводства (1 03 02 земельный участок для коллективного садоводства) | 2400 |
| 4 | Минская область, Смолевичский р-н, Плисский с/с, СТ «Минута», 276 | 624884500001000217 | 0,1021 | для коллективного садоводства (1 03 02 земельный участок для коллективного садоводства) | 4000 |
| 5 | Минская область, Смолевичский р-н, Плисский с/с, СТ «Минута», 304 | 624884500001000170 | 0,0984 | для коллективного садоводства (1 03 02 земельный участок для коллективного садоводства) | 4000 |
| 6 | Минская область, Смолевичский р-н, Плисский с/с, СТ «Колосок-3»,19 | 624884500008000007 | 0,0924 | для коллективного садоводства (1 03 02 земельный участок для коллективного садоводства) | 4000 |
| 7 | Минская область, Смолевичский р-н, Драчковский с/с, СТ «Конверсия», 4 | 624880800010000163 | 0,0579 | для коллективного садоводства (1 03 02 земельный участок для коллективного садоводства) | 8000 |
| 8 | Минская область, Смолевичский р-н, Заболотский с/с, СТ «Вектор-2012», 177 | 624882000053000200 | 0,0912 | для коллективного садоводства (1 03 02 земельный участок для коллективного садоводства) | 15000 |
| 9 | Минская область, Смолевичский р-н, Заболотский с/с, СТ «Вектор-2012», 179 | 624882000053000172 | 0,0921 | для коллективного садоводства (1 03 02 земельный участок для коллективного садоводства) | 15000 |
| 10 | Минская область, Смолевичский р-н, Заболотский с/с, СТ «Вектор-2012», 180 | 624882000053000187 | 0,0920 | для коллективного садоводства (1 03 02 земельный участок для коллективного садоводства) | 15000 |

**Аукцион состоится 28 апреля 2022 г. в 15.00 в Смолевичском районном исполнительном комитете по адресу: г. Смолевичи, ул. Советская, д. 125, зал заседаний.** Извещения о проведении аукциона размещены на сайтах: Государственного комитета по имуществу: https://au.nca.by, http://rlt.by/ru, Смолевичского райисполкома: isp@smolevichi.gov.by.

УНП 600014139

# СПАТКАННЕ Ў ЦЕМРЫ,
## або Самага галоўнага вачыма не ўбачыш

**Пра цэнтр крэатыўных рашэнняў «Нябачны свет», які год таму адкрыўся ў Мінску, я даведалася ад сваіх знаёмых. Яны вярнуліся са спаткання ў цемры пад вялікім уражаннем. І раілі абавязкова перажыць гэты незвычайны досвед.**

### ЗАГАДКА «НЯБАЧНАЙ ЗАЛЫ»

**Кіраўнік праекта Вольга ПАЛАШАВЕЦ** з задавальненнем правяла для мяне экскурсію па «Нябачным свеце». Адзінае месца, куды я так і не трапіла, — за дзверы з надпісам «Нябачная зала». Менавіта там праходзяць спатканні, квэсты, трэнінгі і канцэрты ў абсалютнай цемры.

Самае папулярнае мерапрыемства — рамантычны квэст для пары «Спатканне ў цемры». На працягу 60–90 хвілін мужчына і жанчына пад кіраўніцтвам трэнера выконваюць розныя заданні. Галоўнае правіла — нельга браць з сабой прадметы, якія свецяцца, — гадзіннікі, тэлефоны. Нічога не павінна парушаць цемру.

— Цёмны пакой — гэта заўсёды загадка, інтрыга, — усміхаецца Вольга. — Нават пасля завяршэння спаткання ніхто не бачыць яго. Трэнераў мы таксама не паказваем, яны застаюцца такімі, якімі іх намалявалі ў сваім уяўленні нашы госці.

За год правялі ўжо амаль 200 спатканняў. Прыходзяць пары абсалютна рознага ўзросту, як маладыя, так і тыя, якія разам не адзін пуд солі з'елі. Часта дарослыя дзеці сыходзяць са спаткання з падарункавым сертыфікатам для сваіх бацькоў.

— Спатканне ў цемры — выдатная магчымасць даведацца адно пра аднаго штосьці новае, адкрыць свайго партнёра з іншага боку, — працягвае Вольга. — Бо цемра здымае вонкавую мішуру. Людзі аказваюцца адно перад адным такімі, якія яны ёсць насамрэч. А яшчэ ў цемры вельмі добра праяўляецца стаўленне людзей адзін да аднаго — уменне пачуць, даць магчымасць праявіць сябе партнёру, у патрэбны момант узяць на сябе адказнасць. Так, у нашай скарбонцы ёсць рамантычная гісторыя з добрым фіналам. Дзяўчына запрасіла на спатканне свайго каханага, а той адмовіўся. Тады яна, каб сертыфікат не прападаў, прыйшла на спатканне з сябрам дзяцінства. Потым тэлефанавала і дзякавала. Маўляў, толькі ў цемры змагла разгледзець сапраўдныя пачуцці.

Заданні, якія трэнер прапаноўвае парам, таксама трымаюцца ў сакрэце. Важна, каб людзі не ведалі, што іх чакае ў цемры. Эфект нечаканасці ўзмацняе эмоцыі.

— Хтосьці выходзіць з цёмнага пакоя задумлівы і маўклівы. Хтосьці — вясёлы і ўзбуджаны. Але абыякавым яшчэ ніхто не застаўся. За год праз наш цэнтр прайшло каля 1500 чалавек. Многія вяртаюцца. Хто пабываў на спатканні, прыходзяць на канцэрты. І наадварот.

Увесь час, пакуль мы размаўлялі з Вольгай, з «Нябачнай залы» даносілася музыка. За загадкавымі дзвярыма ішла рэпетыцыя вячэрняга канцэрта, на яго, аказваецца, аншлаг.

— У нас зала невялікая, разлічана на 25 чалавек. А жадаючых амаль у два разы



Вольга ПАЛАШАВЕЦ разам з мужам і трыма сынамі.

больш. Таму будзем рабіць паўтор 1 красавіка. Жывая музыка ў цемры — вельмі незвычайны фармат. Ніхто не адцягвае ўвагу на тое, што адбываецца на сцэне, як выглядаюць музыканты. Ідзе глыбокае пагружэнне ў музыку, а гэта зусім іншая энергетыка.

### «ХАЛОДНАЕ СЭРЦА» НАВОБМАЦАК

Ідэя мерапрыемстваў у цемры — далёка не новая. Вольга прывезла яе з-за мяжы:

— У канцы 2019 года я наведала Германію, каб паглядзець, як там развіваецца прадпрымальніцтва сярод людзей з інваліднасцю. Паміж сустрэчамі наведалі ў Гамбургу музей, дзе экскурсія праходзіць навобмацак.



Разбіць розныя па вазе фігуркі па парах з заплюшчанымі вачыма аказалася не так проста.

Калі мы там апынуліся, я зразумела, якая глыбокая трансфармацыя адбываецца з людзьмі ў цемры. І вырашыла абавязкова стварыць штосьці падобнае ў Мінску. У выніку ідэю падтрымалі дзве мае сяброўкі. Мы доўга шукалі мецэнатаў, інвестараў. Гэта быў пачатак 2020 года. Пандэмія. Усе круцілі каля скроні. «Бізнес? Цяпер? Сур'ёзна?» Спонсараў мы так і не знайшлі. Але ад ідэі не адмовіліся. Уклалі свае грошы і ўсё стварылі ўласнымі сіламі.

У нас у камандзе сёння 13 чалавек, 10 з іх з глыбокімі парушэннямі зроку. Ва ўсіх супрацоўнікаў цэнтра педагагічная ці псіхалагічная адукацыя. Перад тым як пачаць працаваць у нас, яны ўсе прайшлі навучанне. Напрыклад, у штаце працуе дзяўчына, якая скончыла магістратуру. Яна суперкласны псіхолаг, але ў яе першая група інваліднасці. Такім людзям складана знайсці работу, а тым больш цікавую. У нас яны максімальна рэалізоўваюць сябе.

Сёння Вольга і яе каманда прапаноўваюць 19 аўтарскіх праграм у цемры — як для дарослых, так і для дзяцей. Такой іх колькасці няма ні ў адной краіне свету.

— У прыватнасці, на інтэрактыўную праграму «Свет навобмацак», дзе можна не толькі развіць слых, інтуіцыю, нюх, але і навучыцца эфектыўна ўзаемадзейнічаць у цемры, да нас прыходзяць не толькі мінскія школьнікі, але і прыязджаюць класы з рэгіёнаў. Карыстаючца папулярнасцю праграмы «Гары Потар», «Халоднае сэрца», «Дэтэктыўнае агенцтва». Хутка з'явіцца сямейны квэст для бацькоў з дзецьмі па матывах «Брэменскіх музыкантаў». Ёсць нават асобны квэст для мужчын «Асаблівасці нацыянальнага палявання».

Такім чынам, зусім не надакучліва, дзецям і дарослым прывіваюць культуру зносін з невідушчымі людзьмі.

— Чалавек, які наведаў «Нябачную залу», міма невідушчага чалавека ўжо ніколі не пройдзе. Таму што ён выпрабаваў на сабе гэтую гісторыю, прапусціў праз сябе такі стан. Шмат мерапрыемстваў у цэнтры праводзіцца бясплатна. Падчас трэнінгу «Этыка ўзаемадзеяння з невідушчымі людзьмі», які таксама праходзіць у цемры, паказваем сацыяльным работнікам, супрацоўнікам гасцініц, як правільна дапамагаць чалавеку, які нічога не бачыць. А яшчэ ладзім трэнінг для бацькоў невідушчых дзяцей. Каб дапамагчы ім наладзіць камунікацыю, паказаць, што гіперапека — гэта шлях у нікуды.

### «КАЛІ МЕЦЬ ДЗЯЦЕЙ — ТО ШМАТ»

— Асабіста мне пашанцавала з бацькамі. З іх боку ніколі не было гіперапекі, — кажа Вольга Палашавец. (Толькі праз гадзіну размовы я даведваюся, што мая суразмоўніца зусім нічога не бачыць). — Я нарадзілася звычайным дзіцем. Праблемы са зрокам пачаліся, калі мне было тры гады. Няўдала перахварэла на пнеўманію. Хвароба дала ўскладненні, у выніку да першага класа я страціла 97 % зроку. Хоць я і бачыла дрэнна, але энергія праяўлялася бурна. Я пастаянна хадзіла з пабітымі каленкамі, бо падала з ровара і дрэў. Мама вельмі цярпліва гэта пераносіла. Яна ніколі ў жыцці мне не сказала: «Асцярожна, ты ўпадзеш». Бацькі зразумелі, што гэта непазбежна, і, бачачы мой характар, давалі мне магчымасць раскрыць свой патэнцыял.

Вольга з цеплынёй адгукаецца не толькі пра бацькоў, але і пра свайго мужа. З Аляксандрам яна пазнаёмілася яшчэ падчас вучобы ва ўніверсітэце — у афтальмалагічным аддзяленні.

— Саша добра бачыць, проста праходзіў планавае абследаванне. Ён з самага пачатку ведаў, што я магу ў любы момант страціць зрок. Але, ведаючы мой характар, казаў: «А хіба ў табе гэта штосьці зменіць?» Мой муж — той мужчына, дзякуючы якому я ёсць я. Гэта моцны тыл, надзейнае плячо, падтрымка і безумоўнае прыняцце. А апошняе вельмі дарагога варта.

Першы сын Вольгі — Дзіма (яму цяпер 25) — нарадзіўся адразу ж пасля абароны дыплома. Пасля дэкрэта Вольга сышла ў бізнес — адкрыла сваю турфірму. А праз сем гадоў з'явіўся на свет другі сын, Мікалай. Калі хлопчыку споўнілася сем месяцаў, Вольга цалкам аслепла. Аднак гэтае выпрабаванне не зламала жанчыну, хутчэй наадварот. Мала таго, што яна працягвала весці бізнес і ездзіць на мора з дзецьмі, дык і з усёй хатняй работай навучылася спраўляцца самастойна.

— У мяне няма ніякіх памочніц па гаспадарцы, усе жаночыя абавязкі ляжаць на маіх плячах. Я вельмі хутка перастроілася, у мяне не было часу дэпрэсаваць, бо маленькія дзеці, муж. Я магла б сядзець і шкадаваць сябе. Але каму ад гэтага было б лягчэй? Мне? Наўрад ці. Маім хлопчыкам, якія б саромеліся мяне? Я хачу, каб мае дзеці мной ганарыліся. Я павінна быць для іх прыкладам. Мішу я нараджала цалкам невідушчая. Мне ўжо губляць было няма чаго. І вельмі шкадую, што спынілася на траіх дзецях.

Вольга перакананая, што кожны чалавек — каваль свайго шчасця. Напэўна, таму ніколі не пагаджалася з абставінамі, якія ёй прапаноўваліся. Заўсёды імкнулася да большага. Пасля школы скончыла педвучылішча лепш за астатніх, потым юрыдычны факультэт з чырвоным дыпломам. «Нонсэнс, гэта нонсэнс», — паўтаралі педагогі. А Вольга працягвала жыць не «таму што», а насуперак. Калі вучыцца — то лепш за ўсіх. Калі мець дзяцей — то шмат. Калі бізнес — то самы цікавы. Дарэчы, на момант, калі зараджаўся «Нябачны свет», у Вольгі была студыя эстэтычнай касметалогіі і SPA. Яна яе проста прадала. Бо зразумела, што знайшла справу свайго жыцця.

— Вольга, вы адкрылі «Нябачны свет» у пачатку пандэміі. Не баяліся, што ваша задума можа праваліцца, бо людзям будзе не да мерапрыемстваў у цемры?

— Людзі не могуць жыць пастаянна ў стане стрэсу. Трэба неяк папаўняць рэсурс. А мы якраз тая гісторыя, якая дае гэту магчымасць. Да нас, як правіла, прыходзяць, каб паспрабаваць штосьці новае, адчуць яркія эмоцыі. Але атрымліваюць значна больш.

**«Чалавеку, які бачыць, стварыць «Нябачны свет» немагчыма. Каб разумець, што такое цемра і як яна працуе, трэба знаходзіцца ў гэтай шкуры».**

«Цёмны пакой» — гэта гісторыя пра кожнага з нас. У прыватнасці, толькі калі цалкам страціла зрок, я зразумела, што вялікая колькасць унутраных рэсурсаў у мяне знаходзілася ў спячым рэжыме. Яны былі незапатрабаваныя. Мне здавалася, як я цяпер магу катацца на каньках, на роварах, плаваць? Аказалася, што няма нічога немагчымага. Было б жаданне. Насамрэч, чалавек мала ведае магчымасці свайго арганізма. Тама мы і спрабуем людзям паказаць, якую бясконцую колькасць рэчаў можна зрабіць, заплюшчыўшы вочы. Нават для відушчага чалавека на нейкі час «выключыць» зрок — гэта заўсёды гісторыя пра грунтоўнае паглыбленне ў сябе. Цемра — тэрыторыя адкрыццяў. Яна можа даць значна больш, чым мы думаем.

У канцы нашай сустрэчы Вольга прынесла драўляныя фігуркі рознай вагі. Папрасіла мяне навобмацак разбіць іх па парах. Калі расплюшчыла вочы, убачыла, што дапусціла адну памылку. Але вось самае галоўнае адкрыццё: некалькі хвілін мне хапіла, каб зразумець, што цемра — цудоўная магчымасць прыслухацца да сваіх адчуванняў, інтуіцыі. Таму ў маіх планах на гэтую вясну — трапіць за зачыненыя дзверы. На чарговую гадавіну вяселля запрашу мужа на спатканне ў цемры. А першага красавіка схаджу на канцэрт жывой музыкі. Хто са мной?

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**




«Італьянскі дворык». Тут пары пасля спаткання ў цемры могуць за гарбатай абмяняцца ўражаннямі.

# КРЭДА — РАЗВІЦЦЁ І РУХ НАПЕРАД



Васіль і Тамара КАМЯКІ.

## КОНЬ ЗА ДЭКРЭТНЫЯ ГРОШЫ

Хоць няправільна, відаць, называць аднаго Васіля Васільевіча: сваю гаспадарку яны адбудавалі разам з жонкай Тамарай Міхайлаўнай. Васіль сёння — уладальнік фермерскай гаспадаркі «Коланск» Івацэвіцкага раёна, а Тамара, згодна з пасадай, — яе кіраўнік. А з чаго пачыналася іх справа, яны дакладна нават не змаглі згадаць. Няма канкрэтнай даты або знакавай падзеі. Неяк усё развівалася паступова, само па сабе. У самым пачатку 1990-х, калі маладыя вясковыя спецыялісты Тамара і Васіль стварылі сям'ю, яны, напэўна, і не ўяўлялі, што стануць буйнымі гаспадарамі-фермерамі. Тамара працавала настаўніцай пачатковых класаў, Васіль быў ветурачом у мясцовым калгасе. А калі ў 1993 годзе нарадзіўся сынок, то за дэкрэтныя грошы яны купілі жарабя-падлетка і развялі вялікую гаспадарку. «Людзі за дэкрэтныя грошы набывалі нешта з мэблі, бытавой тэхнікі, — з усмешкай згадвае Тамара Міхайлаўна, — а мы прывялі ў хлеў кабылку. Тады ў нас было дзве каровы, куплялі для адкорму цялушак і бычкоў. Свету не бачылі за гэтай гаспадаркай. Але ж у тыя небагатыя 1990-я ў нас была дакладная ўстаноўка, што ўласны дабрабыт можна стварыць толькі сваёй працай».

— Для падсобнай гаспадаркі ўзялі тры гектары зямлі, дзе вырошчвалі бульбу. Тады буйных фермераў яшчэ не было, у вёску па бульбу прыязджалі нарыхтоўшчыкі з Расіі, — згадвала далей Тамара. — Мы з імі пазнаёміліся, яны ў нас бралі бульбу не раз у адносна вялікіх аб'ёмах, завязаліся, можна сказаць, партнёрскія адносіны. І аднойчы яны прапанавалі дапамагчы купіць нам грузавы аўтамабіль, каб мець магчымасць самім вазіць сваю прадукцыю.

## ПЕРШАЯ МАШЫНА І ПЕРШЫ КАВАЛАК ЗЯМЛІ

— Спачатку мы пабойваліся такой здзелкі, якая азначала залезці ў даўгі. А потым усё ж рашыліся. Варта сказаць, што мы даволі хутка адбілі гэтыя грошы, разлічыліся з даўгамі і адчулі, як той казаў, смак. Уласная грузавая фура давала новыя магчымасці, мы афармілі грузаперавозкі, — працягвае галава сям'і. — У Расію везлі тую ж бульбу, адтуль — макароны, цукар, іншыя прадукты, тады папулярны быў падобны бартар. І для нас выгадны. З гэтай машыны зарабілі на іншую, якая ўжо каштавала іншых грошай. Па яе даваліся ехаць у Еўропу. Потым купілі трэцюю, бізнес як быццам пайшоў, стаў развівацца. Але пазней быў прыняты заканадаўчы акт, які забараніў індывідуальным прадпрымальнікам браць на работу людзей, што не з'яўляюцца членамі сям'і. Трэба было мяняць профіль. Адзін са сваякоў, які працуе ў сталіцы, параіў адкрыць фермерскую гаспадарку. Маўляў, вы недалёка ад гэтай работы, варта рызыкнуць і развярнуцца яшчэ больш.

— Тады мы падалі заяву і ўзялі нашыя першыя 27 гектараў зямлі. Зямля была, вядома, не самая лепшая. Я першы раз як убачыла той надзел, мне страшна стала, падалося, што не справімся, — згадвае Тамара Камяк. — Першае, што сказала мужу: «Давай адмовімся». Але ён праявіў цвёрдасць і рашучасць, і ўзяліся асвойваць тыя гектары.

Цяпер яны разумеюць, што гэта быў своеасаблівы іспыт, які наладзіла раённая ўлада. Быў у раёне пэўны негатыўны вопыт, калі фермеры бралі, але не спраўляліся, запускалі ўчастак зямлі да бур'яну. Ды падобнае стаўленне — не ў іх сямейнай традыцыі. Яны ўзяліся грунтоўна, працавалі так, як і на сваіх трох гектарах, як на ўласным агародзе, ураджай атрымалі добры. З культурай земляробства таксама ўсё складвалася, захоўвалі севазвароты. Адным словам, на іх поле было прыемна пaглядзець у любую пару, ды і аддачу зямля давала ў выглядзе ўраджаю. Гэта быў 2007 год. Тамара Міхайлаўна пакінула сваю настаўніцкую работу, бо сумяшчаць стала даволі цяжка. Муж цалкам перайшоў на ўласную гаспадарку яшчэ раней.

## НАРОШЧВАННЕ АБ'ЁМАЎ

Пакрысе стала развівацца вытворчасць. З'явілася больш тэхнікі, бралі на работу новых людзей. З кожным годам фермерская гаспадарка стала прырастаць плошчай. Дабаўлялі па дзясятку альбо некалькі дзясяткаў гектараў. Бралі вельмі асцярожна, столькі, колькі былі ўпэўненыя, што апрацоўсе.



— Мы даўно зразумелі, — гавораць сужэнцы, — што ў сельскай гаспадарцы, каб нешта атрымаць, трэба спачатку ўкласціся ў зямлю. Таму развіваліся паступова, па кроку, з сезона ў сезон.

Згадалі, як першы раз звярнуліся па крэдыт на куплю трактара. У Беларусбанку ім адмовілі, сказалі, што не крэдытуюць фермераў, але там жа параілі звярнуцца ў Аграпрамбанк. Ішлі ўжо, здавалася, без вялікай надзеі, там жа іх зусім не ведаюць. Але ў названым банку аднесліся з разуменнем і пракрэдытавалі набыццё трактара фактычна адразу, затым такім жа чынам купілі другі трактар.

— Наогул нам не раз шанцавала, — разважае Тамара Камяк. — Банк пайшоў насустрач, хоць пэўным чынам рызыкаваў. Бывае, сустракаюся з калегамі-фермерамі з іншых раёнаў, яны такія рэчы расказваюць пра, мякка кажучы, непаразуменні ў стасунках з раённай уладай, што мяне здзіўляе. У нас увесь час адносіны былі даволі канструктыўныя. Узнікаюць час ад часу рабочыя пытанні, але яны і вырашаюцца ў рабочым парадку. І гэта вельмі важна. Важна, што нас падтрымалі з першымі трактарамі, сельгасмашынамі. Цяпер у нас ужо недзе ў суадносінах 60 на 40 працэнтаў — замежная і айчынная тэхніка. Маем трактары «Джон Дзір» коштам каля 100 тысяч долараў, літаральна днямі атрымалі сеялку з Італіі за 25 тысяч еўра, на падыходзе яшчэ адна сельгасмашына.

Як ужо сказана, большую частку таго, што зараблялі, заўсёды ўкладвалі ў вытворчасць. Яны нават дом будавалі восем гадоў. З атрыманага за сезон прыбытку вырывалі трохі, укладвалі ў дом, астатняе — у гаспадарку, налета — тое ж самае. Затое дом у горадзе ўзвялі дыхтоўны, прыгожы. А да той пары сын універсітэт скончыў, жаніцца сабраўся. Вось дом і спатрэбіўся.

## ПРА СЫНА І ДОМ

Сын Міхаіл — іх галоўная надзея, адзіны нашчадак сям'і, да таго ж аднадумец бацькоў, спецыяліст сельгасвытворчасці. Міша, так бы мовіць, вырас на гаспадарцы, быў першым памочнікам. Таму не дзіва, што паступіў у Гродзенскі аграрны універсітэт, каб стаць аграномам. Вучыўся заўзята, з цікавасцю, скончыў факультэт з адзнакай, паралельна атрымаў эканамічную адукацыю. У ліку найлепшых студэнтаў стаў лаўрэатам прэміі імя Аляксандра Дубко. Тады шчаслівыя бацькі ездзілі ў Гродна, іх запрасілі на ўрачыстасць з нагоды прысуджэння прэміі. Потым ён, зноў жа ў ліку найлепшых, паехаў на практыку ў Германію, затым выйграў грант і прайшоў адукацыйны курс у нямецкай аграрнай установе. Пасля яму прапаноўвалі застацца на кафедры роднай ВНУ, мог бы пры жаданні працаваць і ў Еўропе. Але хлопец ужо ведаў, што вернецца ў гаспадарку бацькоў, каб прадоўжыць справу разам і вывесці вытворчасць на новы тэхналагічны ўзровень.

Міхаіл Камяк цяпер працуе аграномам. У яго распісаны кожны тэхналагічны цыкл для кожнай расліны. «Навука ж не стаіць на месцы, — разважае Васіль Васілевіч. — Тым больш я па спецыяльнасці ветурач. А ён сочыць за ўсімі навінкамі ў агратэхніцы, у курсе перадавога сусветнага вопыту. Сёння ў спажыўца на першым месцы — якасць прадукцыі, таварны выгляд, смакавыя характарыстыкі, усё гэта дасягаецца найперш перадавымі тэхналогіямі».

— Сын прыехаў некалькі гадоў таму і раскрытыкаваў мяне адразу, — з усмешкай згадвае Тамара Міхайлаўна: «Накладныя, напісаныя ад рукі — гэта ж XIX стагоддзе». Цяпер у нас дакументы складаюцца ў электронным выглядзе.

Так што новы дом, які будавалі доўга і з любоўю, прыйшоўся дарэчы сям'і сына. Самі ж пакуль жывуць у вясковай хаце, якую ў свой час узводзілі бацькі Васіля. Хата старая, і, на думку гаспадыні, рэканструкцыі не падлягае — яна і са спецыялістамі раілася. Таму прапанавала мужу знесці стары дом, а на яго месцы паставіць новы, а той не згаджаецца: як гэта, маўляў, бацькоўскую хату знесці. Пакуль не знайшлі кансэнсусу, то жывуць у гэтай хаце, каля якой клапатлівай рукой маці і бабулі — Соф'і Феліксаўны — пасаджаны кветкі. Крокусы ў Камякоў цвітуць з пачатку сакавіка, як ні ў кога.

## ЗАДАВАЛЬНЕННЕ АД РАБОТЫ

Паводле слоў жонкі, Васіль — такі чалавек, якога не цікавяць грошы, выгоды, прадметы раскошы, яго цікавяць працэс работы і атрыманне вынікаў, у гэтым бачыць асалоду і задавальненне. Згадаў, нібы між іншым, як прыемна было, як затрапятала душа, калі на рэспубліканскіх «Дажынках» у Горках (2012 год. — **«Аўт».**) яго выклікалі на сцэну ў ліку найлепшых сельгасвытворцаў, на вачах ва ўсёй краіны.

Яна ўжо прапаноўвала спыніцца на гэтым этапе: як быццам ёсць стабільнасць гаспадаркі, ёсць дабрабыт сям'і, у іх жа адзін сын. Працуй пацыху, нібы ў калгасе. Але ён на тое не згодны: калі на год спынішся ў сваім развіцці, знойдзецца той, хто апярэдзіць. А гэта не стасуецца з жыццёвым крэда фермера Камяка. Ён лічыць развіццё абавязковай умовай гаспадарання. Таму з прыходам вясны рэалізоўваюцца новыя ідэі, новыя задумкі, новыя эксперыменты. Ёсць два сховішчы для агародніны, цяпер задумалі будаваць трэцяе. Калі ўраджай добра захаваць да вясны, зусім другі даход атрымаем.

Гаспадарка спецыялізуецца на вырошчванні агародніны: ёсць трохі бульбы, пэўная плошча адведзена пад збожжавыя для севазвароту. Сёння «Коланск» мае 200 гектараў зямлі, невялікую жывёлагадоўчую ферму. Частка прадукцыі ідзе на экспарт. Нарыхтоўчую кантору свайго райспажыўтаварыства і суседніх раёнаў «Коланск» забяспечвае памідорамі, агуркамі, капустай. Адгружаюць іх таксама ў садкі, школы, бальніцы як свайго раёна, так і ў сацыяльныя ўстановы Пінскага і іншых раёнаў. На пастаяннай аснове ў фермерскай гаспадарцы працуе 12 чалавек, хутка яшчэ двое будуць прынятыя на работу. Летам наймаюць некалькі дзясяткаў сезонных рабочых. Гэта праблема ўсіх фермерскіх гаспадарак. Афармленне такіх работнікаў займае вельмі шмат часу. На розных узроўнях яны прапаноўвалі спрасціць такую працэдуру, напрыклад, уносіць нейкую фіксаваную суму ў фонд сацстраху ды ў якасці падатку. Пакуль усё застаецца паранейшаму, але яны з калегамі спадзяюцца, што будуць пачутыя, і справа неяк зрушыцца.

Людзі, якія працуюць у «Коланску», атрымліваюць прыстойную зарплату. Гаспадарка садзіць ім «соткі», правільней сказаць, забяспечвае бульбай, агароднінай. Не забываюць і вясковых пенсіянераў. Па-першае, тыя з іх, каму дазваляюць узрост і здароўе, падпрацоўваюць у якасці сезонных рабочых. Ды і з любой праблемай, калі патрэбна дапамога, транспарт, вяскоўцы ідуць да Тамары Міхайлаўны.

